ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дарковым дадаткам „Прафрух“)
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок пошп. пасьля тэксту—50 к., іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -ная.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

Москва, Б-ка ВСНХ СССР зыл. студ. сыск

КРАЖУ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

АУТОРАК, 16 верасьня 1930 г.
№ 217 (3815)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Пасьля выбараў у рэйхстаг

Прайшоў дзень 14-га верасьня. Скончыліся выбары ў нямецкі рэйхстаг. Атрыманы першыя выніковыя лічбы.

«Лёс пралетарыяту вырашаецца не на парламанцкіх выбарах, а выключна ў адкрытым рэвалюцыйным масавым змаганьні за ўладу» (з «апошняга закліку» ЦК КПН да працоўных выбаршчыкаў). Тым ня менш цяперашнія выбары ў нямецкі рэйхстаг зьяўляюцца вялікай гістарычнай вехай для лёсу Нямеччыны.

Нямеччына перажывае зараз адзін з найбольш вострых момантаў пасьля лістападаўскай рэвалюцыі 1918 году. Глыбокі эканамічны крызіс ахоплівае паступова ўсе галіны нямецкай гаспадаркі, распаўзаецца ўшыркі і прасякае ў глыбіню. **Буржуазія ўсё больш шукае выхаду ў «палітыцы цьвёрдай рукі»**, г. зн. у палітыцы шаленага націску на масы рабочых і працоўных з мэтай перакласьці на іх усе цяжкасьці крызісу.

Ніколі яшчэ ў гісторыі нямецкай рэспублікі ня было такога адкрытага драпежніцкага паходу на жыцьцёвы ўзровень мільёнаў працоўных, як зараз. Нават афіцыйнае статыстычнае выданьне нямецкай дзяржавы, улічваючы становішча рабочае клясы, прыходзіць да высновы, што Нямеччына ідзе насустрач сумнаму часу. Вялізарная большасьць нямецкіх пралетараў атрымлівае на сям'ю ў сярэднім каля 20 р. у месяц. Вялізарная армія ў некалькі мільёнаў беспрацоўных дае магчымасьць нямецкай буржуазіі націскаць з надзвычайнай сілай на заработную плату. Гэтыя-ж буржуазныя эканамічныя органы вважаць, што ў надыходзячым студзені-люты беспрацоўе дасягне свайго найвышэйшага пункту.

Пазбаўленьне вялізных мас беспрацоўных нават мінімальнай дапамогі, скарачэньне страхаваньня па хваробе, самыя нізвычайныя формы падаткаў, — уся гэта палітыка рабаваньня працоўных праводзіцца міністрамі фінансавага капіталу з усёй пасьлядоўнасьцю і жорсткасьцю. **«Тут выйсьце з крызісу»** — крычаць навыперадкі газэты буржуазных партый, натрабуючы зьніжэньня з пункту гледжаньня буржуазіі яшчэ «надта высокага жыцьцёвага ўзроўню» пралетарыяту і ліквідацыі «непрадукцыйных страт», пад якімі разумеюцца выдаткі на сацстрахаваньне і на іншыя патрэбы рабочых.

Для ажыцьцяўленьня гэтай палітыкі націску на рабочую клясу капіталістычныя верхаводы Нямеччыны ставяць на абвестку дня зьмену мэтадаў свайго клясавага панаваньня.

Сьцяг «дэмакратычнай рэспублікі» з яе парламанцкай сыстэмай адкрыта топчацца ў балота. Нямецкая буржуазія трымае курс на фашысцкую дыктатуру.

Пад знакам падрыхтоўкі фашысцкай дыктатуры і набліжэньня рашучых клясавых баёў пралетарыяту, праходзілі выбары ў Нямеччыне.

Што-ж паказаў агляд сіл рэвалюцыі і контр-рэвалюцыі, які адбыўся ў Нямеччыне 14-га верасьня?

Мы пакуль што маем толькі **першыя і няпоўныя** даныя аб нямецкіх выбарах. Але перш-нас, што адразу кідаецца ў вочы, гэта **буйная перамога нямецкай кампартыі**. Нямецкая кампартыя атрымала 4.599.000 галасоў, у параўнаньні з 3.262 тыс. галасоў, якія яна атрымала на выбарах 1928 году, **узрост ліку атрыманых галасоў дасягае 30 проц.** Яшчэ больш выразна гаворыць пра сапраўдны трыўмф нямецкай кампартыі на выбарах 1930 году некалькі тых лічбаў, якія мы маем у разьмеркаваньні галасоў па асобных раёнах. Характэрна, што **ў значнай частцы рабочых раёнаў сьпіс кампартыі** ідзе на першым месцы. Так, напрыклад, камуністы атрымалі ў **Опэльне, Нэйкёльне, Гінзэнкірхэне, Хэмніцы, Фрыдрыхсгайне** і ў шмат іншых рабочых раёнах адносную большасьць галасоў. Характэрна, што камуністычны сьпіс ідзе на першым месцы нават у такіх раёнах, як, напрыклад, **Крэйдзберг**, дзе да гэтага часу сацыял-дэмакратыя мела пераважны ўплыў на рабочыя масы. Камуністы атрымалі ⅓ усіх галасоў, паданых у Бэрлінскай выбарчай акрузе (408 тыс. з агульнага ліку 1.238 тысяч).

На фоне гэтай вялізарнай перамогі кампартыі паўстае асабліва рэльефна паражэньне сацыял-дэмакратыі.

Напярэдадні выбараў сацыял-дэмакратыя асабліва жанглявала «радыкальнымі», «апазыцыйнымі» фразамі, спэкулюючы на ўзрастаючых рэвалюцыйных настроях шырокіх рабочых мас. Аднак, сацыял-дэмакратыя страціла больш 610 тысяч галасоў, у параўнаньні з выбарамі 1928 г. Успомнім, між іншым, пра тое, што і на выбарах 1928 году сацыял-дэмакратыя страціла значную частку сваіх галасоў.

Вартым увагі зьяўляецца надзвычайны **рост ліку галасоў, атрыманых выразна фашысцкімі партыямі, у першую чаргу «з-пад сьцягу» нацыянал-сацыялістых.**

Гэты рост галасоў адбыўся за кошт зьмяншэньня галасоў «сярэдзінных» партый нямецкай буржуазіі, якое адбылося пры гэтых выбарах. Так, напрыклад, колькасьць галасоў, адданых на сьпіс партыі «нямецка-нацыянальнай» паменшылася, амаль што па 2 мільёны, «народнай» партыі — больш чым па 700 тыс. галасоў і г. д.

Аб чым сьведчаць усе гэтыя папярэднія даныя?

Гэтыя лічбы перш за ўсё гаворяць аб **надзвычайным абвастрэньні клясавай барацьбы ў Нямеччыне**, аб росьце напружанасьці гэтае барацьбы, аб тым, што ветразь нямецкага дзяржаўнага карабля шпаркім тэмпам імчыцца да фашысцкай дыктатуры. Гэтыя даныя гаворяць аб тым, што ўсё больш набліжаюцца рашучыя клясавыя баі.

Гэтыя даныя сьведчаць аб надзвычай **шпаркім працэсе радыкалізацыі, росту рэвалюцыйных настрояў, якія адбываюцца ў нетрах рабочых мас.** Рабочыя масы адыходзяць ад сацыял-дэмакратыі, якая сьцеле дарожку фашысцкай дыктатуры.

Вынікі выбараў гавораць аб тым, што кампартыя Нямеччыны вядзе непрымірымую барацьбу за ленінскую лінію Камінтэрну, і, дзякуючы гэтаму, знаходзіцца на шляху заваяваньня большасьці рабочае клясы Нямеччыны. Гэта задача зьяўляецца і надалей важнейшай задачай, што стаіць перад нямецкай кампартыяй. Шпарка ўзрастае ўплыў нямецкай кампартыі, якая змагаецца **«не за ўрадавыя пасты і тлустыя міністэрскія партфэлі, а за вызваленьне ўсіх прыгнечаных і эксплёатаваных»** (З адозвы ЦК КПН). Кампартыя Нямеччыны на гэтых выбарах атрымала значна больш, чым палавіну галасоў, атрыманых нямецкай сацыял-дэмакратыяй. Галасы, адданыя на чырвоныя сьпісы, гэта галасы пралетараў, у той час, калі значны лік галасоў, атрыманых сацыял-дэмакратамі, належыць дробнай буржуазіі. Але ўсё-ж такі за сьпіс сацыял-дэмакратаў яшчэ аддалі свае галасы тысячы ашуканых пралетараў. Перад кампартыяй стаіць важнейшая задача заваяваньня гэтай часткі пралетарскіх мас, што яшчэ не адышлі ад сацыял-фашысцкай дэмакратыі.

Вынікі выбараў сьведчаць аб тым, што, як мы ўжо вышэй адзначалі, сымпатыі нямецкай буржуазіі ўсё больш схіляюцца да мэтадаў адкрытай фашысцкай дыктатуры.

Падагульваючы першыя вынікі гэтых выбараў, трэба адзначыць, што **кампартыя Нямеччыны з гонарам вытрымала гэта блазное выпрабаваньне, якім зьяўляліся выбары ў рэйхстаг.**

Сьвядомыя рабочыя Нямеччыны ўжо даўно расчараваліся ва ўсякіх «дэмакратычных» мэтадах. Яны адкінулі і адкідваюць у сьметнік гісторыі ўсе ілюзіі наконт «парламантарызму» і буржуазнай «дэмакратыі». **Пытаньні клясавай барацьбы, пытаньні ўлады вырашаюцца не з дапамогай выбарчых бюлетэняў, а шляхам узброенага, змаганьня на барыкадах.**

Пад сьцягам атрыманых перамог кампартыя Нямеччыны з яшчэ большай энэргіяй будзе працягваць змаганьне з пагрозай фашысцкай дыктатуры ў Нямеччыне, **за Савецкую Нямеччыну.**

Выстаўка---дэманстрацыя посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва БССР

Учора Менск наведаў старшыня бюджэтнай камісіі ЦВК СССР т. **Чуцкаеў**, які азнаёміўся з Усебеларускай выстаўкай.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам тав. Чупкаеў сказаў наступнае:

— У мінулым годзе пытаньне аб мэтазгоднасьці водпуску сродкаў на выстаўку выклікала сумненьне ў бюджэтнай камісіі ЦВК СССР. Агляд-зёўны выстаўку, я пераканаўся, што яна **своячасова і патрэбна.**

Выстаўка дэманструе як натуральныя багацьці Беларусі, так і дасягненьні яе ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва. Выстаўка набывае вялікую паказальна-асьветную ролю і павінна мабілізаваць увагу і энэргію мас на далейшыя перамогі ў сацыялістычным будаўніцтве.

Вялізарнае ўражаньне застаецца ад шырока і правільна задуманага плян[illegible] мі паказальна акрэсьлівае яе асноўную ідэю. Прыходзіцца пераканацца, якія вялізарныя посьпехі ёсьць ў галіне сельскае гаспадаркі БССР, у асабліваści ў яе сацыялістычным сэктары. Павільён масавых экспанатаў, дзе прадстаўлены дасягненьні калгаснага сэктару, асабліва паказальны.

Вялікае ўражаньне зрабіў на мяне таксама павільён жывёлагадоўлі, павільён рагатай жывёлы, дзе прадстаўлена чырвоная мясцовая парода, якая ня горш, чым заграніччная — ангельская, нямецкая і інш. Гэта галіна гаспадаркі БССР відавочна патрабуе асаблівай увагі ўрадавых органаў. Вялізарныя дасягненьні сацыялістычнай прамысловасьці бачны з азнаямленьня з павільёнам прамысловасьці. Апошні відавочна дэманструе ператварэньне БССР у аграрна-індустрыяльн[illegible]

ВЯЛІКАЯ ПЕРАМОГА НЯМЕЦКАЙ КАМПАРТЫІ

На выбарах у рэйхстаг камуністыя атрымалі 4.599.000 галасоў і 76 мандатаў

Рабочая кляса Нямеччыны перад новымі жорсткімі клясавымі баямі

Вынікі выбараў

БЭРЛІН, 15. Канчатковыя вынікі выбараў у рэйхстаг па ўсіх 35 акругах прадстаўляюцца ў наступным выглядзе (у дужках падаем даныя выбараў у рэйхстаг у 1928 г.): усяго падана галасоў 35 мільёнаў. З іх кампартыя атрымала 4.599.000 (3.262.548), сацыял-дэмакраты—8.536.000 (9.146.165), нацыянал-сацыялістыя (фашыстыя) 6.375.000 (809.541), партыя цэнтру — 4.549.000 (3.711.122), нацыяналістыя — 2.439.000 (4.376.173), народная партыя — 1.996.000 (2.677.861), гаспадарчая партыя — 1.352.000 (1.395.599), дзяржаўная партыя — 1.186.000 (дэмакраты атрымалі ў 1928 г. 1.503.779), Ландфольк (кулацкая партыя) — 1.103.000, баварская народная партыя — 1.118.000 (943.572).

Паводле папярэдніх падлікаў агульнае разьмеркаваньне мандатаў у будучым рэйхстагу прадстаўляецца ў наступным выглядзе: камуністыя--76, сацыял-дэмакраты — 142, нацыянал-сацыялістыя — 106, цэнтр — 76, нацыяналістыя — 41, народная партыя—33, гаспадарчая партыя — 23, дзяржаўная партыя — 20.

ХОД ВЫБАРАЎ

БЭРЛІН, 14. Да 12 гадзін ночы былі наступныя выніковыя даныя па асобных гарадох і раёнах. Заключныя рэзультаты з **Бэўтэна** (выбарчая акруга Опельн): камуністыя — 22.000, сацыял - дэмакраты — 6.200, нацыянал-сацыялістыя — 5.000, цэнтр — 15.200, нацыяналістыя — 10.000, народная партыя — 813, дзяржаўная партыя — 860, гаспадарчая партыя — 2.200, палякі—3.100 галасоў. **Гельзенкірхен:** камуністыя —45.500, сацыял - дэмакраты — 23.800, нацыянал - сацыялістыя—17.800, цэнтр —40.400, нацыяналістыя — 10.600, народная партыя — 14.900, дзяржаўная партыя — 1.700, гаспадарчая партыя—6.300, сялянска - сацыяльная партыя—5.200 галасоў. **Хэмніц:** камуністыя — 40.500, сацыял - дэмакраты — 64.200, нацыянал - сацыялістыя—19.400, цэнтр —1.300, нацыяналістыя — 12.600, народная партыя — 10.500, дзяржаўная партыя — 5.000, гаспадарчая партыя — 16.200, сялянска - сацыяльная партыя—3.800 галасоў. **Ганаў:** камуністыя—7.200, сацыял - дэмакраты—4.400, нацыянал-сацыялістыя — 3.400, цэнтр — 2.000, нацыяналістыя — 474, народная партыя —259, дзяржаўная партыя—4.400, гаспадарчая партыя—200 галасоў. **Крэйцбэрг** (раён Бэрліну), які лічыўся да гэтага часу цытадэляй сацыял - дэмакратыі: камуністыя — 70.400, сацыял - дэмакраты — 69.000, нацыянал - сацыялістыя — 24.000. У **Нэйкёльне і Фрыдрыхсгайне** (раёны Бэрліну) камуністыя атрымалі большасьць. У Фрыдрыхсгайне камуністыя атрымалі 73.000 галасоў, сацыял - дэмакраты—58.000. У чатырох раёнах **Бэрліну** камуністыя займаюць першае месца па ліку атрыманых галасоў. Па акрузе **Бэрлін:** — усяго падана галасоў — 1.238.000 (1.190.000). Падана за камуністыя — 408.000 (352.000), за сацыял - дэмакратаў — 346.000 (405.000), за нацыянал-сацыялістых (фашыстых) — 158.000 (17.000), цэнтр — 54.000 (40.000), нацыяналістых — 145.000 (186.000), народная партыя — 27.000 (51.000), дзяржаўная партыя—53.000 (80.000), гаспадарчая партыя — 27.000). (ТАСС).

РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ МАНДАТАЎ У НОВЫМ РЭЙХСТАГУ

БЭРЛІН, 15. Згодна папярэдніх афіцыйных даных, у новым рэйхстагу будуць прадстаўлены 573 дэпутаты (было 491 дэпутат). Яны разьмяркоўваюцца наступным чынам: камуністых—76 (54), сацыял-дэмакратаў — 143 (153), нацыянал-сацыялістых — 107 (12), нацыяналістых — 41 (73), цэнтру — 69 (62), народнае партыі — 26 (45), дзяржаўнай партыі — 22 (дэмакратаў 25), гаспадарчай партыі — 23 (23), баварскай народнай партыі — 18 (17), Ландфольк (кулацкая партыя) — 18 (10), іншых партый — 30.

САЦ.-ЛЁКАІ РАЗАМ З ФАШЫСТЫМІ АБСТРЭЛЬВАЛІ БУДЫНАК КАМПАРТЫІ

БЭРЛІН, 14. 13-га ўвечары капя будынку нямецкай кампартыі раптоўна пранесьліся чатыры грузавых машыны з нацыянал - сацыялістымі, якія кідалі ў вокны будынку кампартыі і ў рабочых, якія стаялі ля дому, піўныя бутэлькі і абстрэльвалі будынак з рэвальвэраў. Паліцыя, якая была на грузавіках з фашыстымі, таксама адкрыла агонь на дому кампартыі. У працягу некалькіх мінут было дана больш 100 стрэлаў. Адзін рабочы забіты, многія паранены. Пляц хутка напоўніўся ўсхваляванымі рабочымі, якія выказвалі сваё абурэньне. Ян падае «Ротэ Фанэ», адзін з паліцэйскіх афіцэраў, якія абстрэльвалі разам з фашыстымі будынак кампартыі, зьяўляецца членам с.-д. партыі.

КРЫВАВЫЯ СУТЫЧКІ З ФАШЫСТЫМІ Ў ЛЕЙПЦЫГУ

БЭРЛІН. Выбары закончыліся а 5-й гадзіне ўвечары. На працягу ўсяго дня камуністыя, нацыянал - сацыялістыя і с.-д. вялі ўзмоцненую агітацыю. Паліцыя арыштавала больш 200 чалавек, галоўным чынам, камуністых. У Бэрлінскім раёне Бітэнаў нацыянал - сацыялістыя забілі аднаго рабочага. Буйная сутычка адбылася ў Лейпцыгу, дзе нацыянал - сацыялістыя прабавалі напасьці на агітацыйны пункт кампартыі, але сустрэлі рашучае супраціўленьне. З абодвых бакоў шмат цяжка параненых.

Рабочыя кварталы Бэрліну—суцэльнае чырвонае мора

КРЫВАВЫЯ СУТЫЧКІ З ПАЛІЦЫЯЙ І ФАШЫСТЫМІ

БЭРЛІН. У Бэрліне, у апошні вечар перад выбарамі, кампанія ў карысьць камуністычнага сьпісу дасягнула свайго кульмінацыйнага пункту. Вэдынг, Нэйкёльн, Фрыдрыхсгайн, Ліхтэнбэрг (рабочыя кварталы Бэрліну) прадстаўлялі сабой суцэльнае чырвонае мора. Групы рабочых аб'яжджалі горад на грузавіках з лёзунгамі кампартыі. У цэнтр гораду накіравалася калёна на 30 грузавіках з рабочымі, якія выкрыквалі рэвалюцыйныя лёзунгі. Сотні рабочых на вэлёсыпэдах, упрыгожаных чырвонай матэрыяй, аб'яжджалі горад, заклікаючы галасаваць за кампартыю. У шмат якіх частках гораду адбыліся мітынгі рэвалюцыйных рабочых. У асобных раёнах мітынгі разганяліся паліцыяй, якая дзейнічала з асаблівай жорсткасьцю. У часе прадвыбарчых дэманстрацый у Бэрліне і інш. гарадох Нямеччыны адбыліся буйныя сутычкі паміж рэвалюцыйнымі рабочымі і паліцыяй. Нацыяналісты на раз нападалі на рабочых. Асабліва сур'ёзныя сутычкі мелі месца ў Швэрцы капя Дортмунда. У самім Дортмундзе рабочыя аказалі энэргічнае супраціўленьне. У Бэрлін - Брандэнбурскай акрузе ў пэрыяд прадвыбарчай кампаніі ў нямецкую кампартыю ўступіла 2.302 новых члены.

ЯШЧЭ НЯ ПОЗНА

Максымальна скарыстаць восень для барацьбы за сілас

Прарыў на сіласным фронце злачынна паглыбляецца

Рагачоўскія работнікі адпачываюць на дасягнутых посьпехах. Соромна, таварышы!

Дождж залівае сіласныя ямы. Вежы і траншэі пустуюць. Да адказу вінаватых!

Выходзьце на барацьбу за прэмії Белмалжывсаюзу і Жывёлаводцэнтру СССР!

400 БАЙЦОЎ ЗА СІЛАС

СЛУЦАК. (Брыгада «ЗЬВЯЗДЫ»). Слуцкі раён дабіўся некаторага пералому ў сіласным будаўніцтве і сіласаваньні кармоў. На превядзеньне сіласаваньня мабілізаваны 400 КАМСАМОЛЬЦАЎ І ЧЛЕНАЎ ПРАФСАЮЗАЎ. Мабілізаваныя разьбіты на 26 брыгад, якія абслугоўваць 28 калгасаў. У брыгады ўваходзяць аграномы і спэцыялісты для тэхнічна-практычнага кіраўніцтва работай брыгадзіраў.

Брыгадзіры паставілі перад сабой задачу не выяжджаць з кожнага калгасу да таго часу, пакуль плян сіласаваньня ня будзе выкананы. Мяркуецца, што сіламі брыгад будуць падрыхтаваны 150 СІЛАСНЫХ ЯМ. На превядзеньне сіласаваньня мабілізавана таксама студэнцтва.

СПАЛОХАЛІСЯ ПЛЯНАЎ

КЛІМАВІЧЫ. (Ад нашага спэцкора). Клімаўшчына павінна засілісаваць у бягучым годзе **24.500** тон сіласнай масы. Калгасы павінны пабудаваць з сіласныя вежы і 154 траншэі і ямы, вытворчыя аб'яднаньні—30 сіласных ям і індывідуальны сэктар — 52 сіласныя траншэі. Варта адзначыць, што гэта заданьне зьяўляецца **мінімальным** і яго можна лёгка ня толькі выканаць, але і **перавыканаць.**

Інакш разважаюць работнікі Клімавіцкага РВК. Кіраўнікі зямчасткі райвыканкому ня вераць у рэальнасьць гэтых заданьняў і лічаць іх непасільнымі. І таму зусім ня дзіва, што сіласаваньне на Клімаўшчыне праходзіць **надзвычай дрэнна.** Дзесяткі выкаланых ям заліваюцца дажджом. Ніхто ня думае аб іх загрузцы. Да 30-ці сіласных траншэй заліты вадой.

Толькі за апошнія дні заўважаецца некаторы, праўда зусім нязначны, пералом. Раённыя работнікі мабілізаваны на превядзеньне сіласнай кампаніі. У калгасы зараз накіравана 26 тэхнікаў, якія практычна праводзяць сіласнае будаўніцтва і сіласаваньне кармоў. Камсамольская арганізацыя стварыла 8 ударных сіласных брыгад. Гэтыя брыгады працуюць у 20-ці калгасах і 2-х саўгасах.

Але ўсё-ж практычныя вынікі яшчэ **зусім нездавальняючыя.** Процант выкананьня сіласнага пляну яшчэ надзвычай **мізэрны.**

Ц—н

ЗМАГАЙЦЕСЯ ЗА ПРЭМІІ

Белмалжывсаюз разасłаў усім райсаюзам дырэктыўны ліст, у якім гаворыцца:

Ня гледзячы на сыгналізацыю аб зрыве сіласаваньня на мясцох, лічбы выкананьня пляну да гэтага часу **ганебна нязначныя.**

У цяперашні момант **ня можа быць** і размовы аб скарачэньні пляну сіласаваньня. Плян павінен быць **выкананы. Прарыў можна яшчэ ліквідаваць.** Застаўся апошні тэрмін — восень. Гэты тэрмін павінен быць максымальна скарыстаны. Патрэбна надзвычайная напружанасьць усіх сыстэмы, выкарыстаньне ўсіх без выключэньня работнікаў, якія могуць практычна дапамагчы правядзеньню сіласаваньня. Шчыльна зьвяжэцеся з камсамолам і іншымі грамадзкімі і кааперацыйнымі арганізацыямі.

У мэтах ажыўленьня ўсёй кампаніі Белмалжывсаюз пастанавіў вылучыць **спэцыяльны фонд для прэміяваньня раёнаў, калгасаў, таварыстваў, паселішч, якія выканалі і перавыканалі плян сіласаваньня, а таксама асоб, якія актыўна праявілі сябе ў змаганьні за сілас.**

Для прэміяваньня вылучаны Белмалжывсаюзам адзін сьцяг, дзьве жняварункі, дзьве сенакасілкі, 2 кон. грабліў, 10 сячкарань, 2 сепаратары, радыёпрыёмнікі, бібліятэкі, розныя с.-г. машыны і г. д.

Разам з гэтым Жывёлаводцэнтр СССР вылучыў для тэй-жа мэты 2 сіласныя вежы, 1 сьцяг, вэлёсыпэды, гадзіньнікі, 100 плем. баранаў, 50 быкоў-вытворцаў і г. д.

Арганізуйце сацыялістычнае спаборніцтва паміж райсаюзамі, таварыствамі, калгасамі, паселішчамі і асобнымі работнікамі на большую колькасьць і якасьць сіласнай масы, на хуткасьць і лепшую загрузку сілясу, на найлепшае выкарыстаньне наяўных сячкарань і сіласарэзак.

Праўленьне БМЖС.

КІНЕМ УСЕ СІЛЫ НА ФРОНТ СІЛАСАВАНЬНЯ

У бюро ЦК ЛКСМБ

ПЛЯН СІЛАСАВАНЬНЯ НА МЯСЦОХ САРВАНЫ. ЗАСТАЎСЯ АПОШНІ І РАШАЮЧЫ ТЭРМІН — ВОСЕНЬ. ТРЭБА ЗАРАЗ-ЖА КІНУЦЬ НА ФРОНТ СІЛАСАВАНЬНЯ ЎСЕ СІЛЫ, КАБ ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫЎ.

ПРАЎЛЕНЬНЕ БЕЛМАЛЖЫВСАЮЗУ І ЯЧЭЙКА КП(б)Б ЛІЧАЦЬ ПАТРЭБНЫМ ЗЬВЯРНУЦЦА Ў БЮРО ЦК ЛКСМБ З ПРОСЬБАЙ АБ АБВЯШЧЭНЬНІ МАСАВАЙ МАБІЛІЗАЦЫІ КАМСАМОЛЬЦАЎ НА ПРАКТЫЧНУЮ ДАПАМОГУ СПРАВЕ СІЛАСАВАНЬНЯ (КАПАНЬНЕ ЯМ, ЗАГРУЗКА СІЛАСНАЙ МАСЫ І Г. Д.).

ПРАЎЛЕНЬНЕ БМЖС.
ЖУРОМСКІ.
ЯЧЭЙКА КП(б)Б: ЕЛЬЯШЭВІЧ.

АДПАЧЫВАЮЦЬ НА ПОСЬПЕХАХ

РАГАЧОЎ. (Брыгада «ЗЬВЯЗДЫ»). Нядаўна мы паведамлялі аб тым, што Рагачоўскі раён добра праводзіць сіласаваньне. Раённыя работнікі, убачыўшы, што іх пахвалілі, парашылі адпачыць на дасягнутых посьпехах. За апошні час у раёне заўважаецца значнае паслабленьне сіласнага будаўніцтва і сіласаваньня кармоў.

У раёне ямы выкаплі, а загрузку іх не праводзяць. Большасьць сіласных ям да сягоньняга дня не загружана.

Ю. Б.

ПРЫЦЯГНУЦЬ ДА АДКАЗНАСЬЦІ

БЫХАЎ. Плян сіласнага будаўніцтва і сіласаваньня кармоў у Быхаўскім раёне **зрываецца.** Партыйныя ячэйкі, камсамол, раённы выканком пальцам не паварушылі, каб забясьпечыць выкананьне прамфінплану.

З падворнага боку сіласнае будаўніцтва у Быхаўскім раёне разгорнута. Амаль усе калгасы выкапалі ямы. Аднак, далейшая работа спынілася. Толькі ў калгасах імя 1-га мая і імя Сьнярдлова сіласныя ямы абліцаваны. Рэшта калгасаў, выкапаўшы ямы, больш нічога ня робіць. Дождж заліў ямы вадой. У шмат якіх калгасах ямы абвалiліся.

У індывідуальным сэктары сіласаваньне **зусім не праводзіцца.** Адзінаасобнікі выкапалі толькі адну яму, ды і тую не закончылі. Райвыканком на гэта не рэагуе. Ён піша дырэктывы райкалгасаюзу, райкалгасаюз тое-ж самае робіць у адносінах да агранома і тэхніка, а справа стаіць на мёртвым пункце. Работнікі райвыканкому ні аднаго разу ня выехалі на месцы, каб азнаёміцца з сапраўдным становішчам сіласаваньня. Раённая арганамія ў сваю чаргу злачынна ігнаруе сілас. Нічога ня робіць па сіласаваньні, напрыклад, раённы агранам Харытановіч.

Пад суд за такую работу.

ОЛЬКОР

У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

Маршал хваліцца турэмнымі парадкамі

Чарговае выступленьне Пілсудзкага

У польскім друку апублікавана новая гутарка з Пілсудзкім. «Пры разьвіцьці нашага так званага парламантарызму,— гаворыць Пілсудзкі, — увайшло ў звычай, што супольнікі таго ці іншага выступленьня, або злачынства не аддаваліся пад суд. Такая беспакаранасьць пры апошнім сойме дайшла ўжо да ней кіх страшэнных памераў, якія перавышалі мажлівасьці цярпець гэта надалей.

Я асабіста, — гаворыць Пілсудзкі, — наогул ня выношу беспакаранасьці, якая прыводзіць, натуральна, да разбэшчанасьці і паніжэньня ўсякага пачуцьця звычайнай маральнасьці. Таму адразу рашыўся выкарыстаць той час, калі паслы стануць звычайнымі грамадзянамі, каб хоць раз у Польшчы паставіць справядлівасьць на такую нармальную дарогу, якая-б не парушалася так агідна, як гэта рабілі паслы з імунітэтам у зубах.

Далей Пілсудзкі гаворыць, што арышты з пункту погляду выбару асоб зьяўляюцца выпадковымі. Мог-бы выбіраць кожнага пятага, або дзесятага. Бо сапраўды, паном паслом надабаўся даволі дзіўны спосаб жыцьця: для абароны «свабоды права» амаль што садзіліся на вуліцы, каб брудзіць з імунітэтам ў зубах. Пераносіць гэтага нельга. Такая недатыкальнасьць пасольская зьяўляецца такімі зьдзекамі над пачуцьцём справядлівасьці і такім агідным таптаньнем гонару самой інстытуцыі сойму, што далей ісьці нима куды. Гэта ёсьць адна з найбольшых няпрыстойнасьцяй пэрыяду мінулага соймаўладзтва. Іменна гэта няпрыстойнасьць заўсёды насоўвала мне думку, што галоўнай мэтай у рабоце паноў паслоў зьяўляецца беспакаранасьць.

Далей Пілсудзкі, пераходзячы да асоб арыштаваных паслоў, заяўляе, што сярод паслоў ёсьць некалькі, як **Квяткоўскі і Бацмагі**, якія абвінавачваюцца ў звычайных злачынствах, якія ў часе перавозу іх у турму бязупынна крычалі, што яны зьяўляюцца паламі. **А Дэмбскі** выбіў нават шыбу ў аўтамабілі, у якім яго перавозілі. Адзін толькі пан **Вітас** зьвярнуў на сябе маю ўвагу сваім спакойным настроем і паслушэнствам. Вітас захаваў у сабе годнасьць чалавека.

Арышты аказаліся вельмі карысным сродкам. Да гэтага часу не атрымана ніякіх скаргаў. Арыштаваныя, пазбавіўшыся сваіх ілюзій, трымаюцца спакойна. Турэмная дысцыпліна цьвёрдая, таму, калі гэтыя паны выйдуць з турмы, яны будуць людзьмі больш дысцыплінаванымі.

На пытаньне адносна чутак, якія нашыраюцца сярод грамадзкасьці аб тым, што ўрад мае намер абыйсьціся бяз сойму, Пілсудзкі адказаў, што гэта пытаньне зьяўляецца надзвычай важным і глыбокім, бо парламантарызм ва ўсім сьвеце ахоплен хваробай. Пілсудзкі заяўляе, што ён ня думае, каб можна было абыйсьціся без прадстаўніцтва, якое ўладае пачуцьцём адказнасьці. У тойжа час ён ня можа не зазначыць на тое, што ўсё, што адбываецца ў Польшчы ў гэтым абсягу, прыводзіць да таго, што захаваць гэтыя прынцыпы вельмі цяжка.

Мітынгі цэнтра-левай „апазыцыі“ ў Варшаве

ВАРШАВА. У Варшаве адбыўся мітынг цэнтра-левай «апазыцыі», на які сабралася ня больш 1.000 чалавек. Пасьля мітынгу стыхійна пачалася дэманстрацыя. Пры выхадзе на Уяздоўскія Алеі, дэманстранты былі атакаваны паліцыяй. Частка дэманстрантаў аказала супраціўленьне. Ёсьць забітыя і параненыя. Паліцыя ачапіла ўсе раёны. Пакуль зарэгістраваны адзін забіты і 8 параненых. Зроблена шмат арыштаў.

Карэшце „знойдзен“

Хто арганізатар замаху

ВАРШАВА. Агенцтва Пат паведамляе, што арганізатар замаху на поўнамоцнае прадстаўніцтва СССР у Варшаве ПАЛЯНСКІ быў арыштаваны ў Любляне (Юга-Славія). Югаслаўскія ўлады парашылі задаволіць патрабаваньні польскіх судовых улад аб выдачы Палянскага.

Па Савецкім Саюзе

ЗА САВЕЦКАЕ ДЫРЫЖАБЛЯБУДАЎНІЦТВА

На пабудову дырыжаблю імя „Правды“

Рабочы каўбаснай фабрыкі тав. ФЕДАРЭНСКІ ўносіць на пабудову дырыжаблю імя «Правды» пяць рублёў і ВЫКЛІКАЕ РАБОЧЫХ МЕНХЛАДАБОЙНІ, КАНТОРЫ БЕЛМЯСА і ўсіх таварышоў з каўбаснай фабрыкі пасьледваць яго прыкладу.

СТВАРАЕМ КАМІТЭТ САДЗЕЙНАСЬЦІ

ВАРОНЕЖ, 15. Пры рэдакцыі абласной газэты «Камуна» створаны камітэт садзейнасьці савецкаму дырыжаблябудаўніцтву. Калектыў супрацоўнікаў выдавецтва ўнёс 400 рублёў на пабудову дыржаблю «Правда» і выклікае ўсе абласныя, раённыя і фабрычна-заводзкія друкаваныя газэты.

БРАНСК, 12. Заклік «Правды» садзейнічаць савецкаму дырыжаблябудаўніцтву падхоплены рэдакцыяй «Брянскага Рабочего». Створана група садзейнасьці. Пачаліся адлічэньні і выклікі.

СУПРАЦОЎНІКІ «НИЖЕГОРОДСКОЙ КОММУНЫ»--НА ПАБУДОВУ ДЫРЫЖАБЛЯ «ПРАВДА»

НІЖНІ-НОЎГАРАД, 15. Група супрацоўнікаў «Нижегородской коммуны» ўнесла на пабудову дырыжаблю «Правда» 203 руб. і выклікала ўсіх супрацоўнікаў і чытачоў краявых і раённых газэт.

Чырвоная армія--армія сусьветнай рэвалюцыі

ДА ДЗЕСЯЦІГОДЗЬДЗЯ ПЕРШАГА КОННАГА КОРПУСУ

ПРАСКУРОК, 13. На сьвяткаваньне дзесяцігодзьдзя першага коннага корпусу прыехалі члены Палітбюро французкае кампартыі тав. **Мамусо, Фрашон** і член ЦК тав. **Боншэ.** На парадзе яны віталі запароскую коную дывізію імя французкай кампартыі. Тав. Мамусо сказаў:

«Я ня маю слоў для выражэньня ўсёй глыбіны сваіх уражаньняў. Парад робіць уражаньне непераможнай сілы. У абучэньні і быце чырвонага казацтва адчуваецца інтэрнацыянальнае выхаваньне. Чырвоная армія — армія сусьветнай рэвалюцыі, У сваёй барацьбе мы не адзінокі—працоўныя ўсяго сьвету з намі».

Усюды рабочыя і сяляне сустракалі дэлегацыю авацыяй.

ЛЕДАКОЛ «СЕ

У НАГУ З РАБОЧАЙ КЛЯСАЙ!

Спэцыялістыя фабрыкі „Гэрой Працы", Лесааб'яднаньня, Хэмаб'яднаньня узялі на сябе абавязак—

НЕ ПАКІДАЦЬ ПРАДПРЫЕМСТВА ДА КАНЦА ПЯЦІГОДКІ

Інжынэры і тэхнікі, будзьце сапраўднымі ўдзельнікамі сацыялістычнай будоўлі!

Агульны сход супрацоўнікаў апаратаў ВСНГ і БЕЛПАПЕРАБ'ЯДНАНЬНЯ, пасьля прапрацоўкі адозвы ЦК УсеКП(б), абвясьціў сябе мабілізаваным на ліквідацыю прарываў у прамысловасьці. Рад інжынэрна-тэхнічных работнікаў накіроўваецца НА ПРАДПРЫЕМСТВЫ.

***

10 адказных супрацоўнікаў хэмаб'яднаньня, абмеркаваўшы адозву ЦК УсеКП(б), і поўнасьцю ўсьвядоміўшы вялікае значэньне разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва, прымаючы пад увагу асаблівае цяжкае становішча з кадрамі ў Савецкім Саюзе, у прыватнасьці ў БССР, абвясьцілі сябе мабілізаванымі і далі абавязацельства не пакідаць работу ў хэмаб'яднаньні да канца пяцігодкі.

***

Агульны сход супрацоўнікаў павукова-дасьледчага інстытуту прамысловасьці пры СНК БССР, падаючы вялікае палітычна-гаспадарчае значэньне адозве ЦК УсеКП(б), пастанавіў накіраваць на прадпрыемствы, дзе ёсьць прарывы, **ня менш 5 спэцыялістых, узяць на грамадзкі буксір** прадпрыемствы, якія найбольш адстаюць, для аказаньня ім навукова-тэхнічнай і арганізацыйнай дапамогі ў справе ліквідацыі прарываў.

Апрача таго, сход пастанавіў пачаць кампанію за прымацаваньне да інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу інстытуту лепшых ударнікаў і рабочых-выдвіжэнцаў у мэтах узьвышэньня іх кваліфікацыі **і падрыхтоўкі з іх навукова-інжынэрна-тэхнічных кадраў.**

Сход выклікаў па сацспаборніцтву **у правядзеньні гэтай работы інстытут імя Леніна, інстытут аховы працы і палітэхнічны інстытут.**

Старшыня сходу **Шахлевіч.**

***

Нарада інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу папяровай фабрыкі «ГЭРОЙ ПРАЦЫ» (Добруш), заслухаўшы інфармацыю аб выніках выкананьня прамфінпляну за 11 месяцаў бягучага году і аб задачах 3-га году пяцігодкі, **З УСЁЙ РАШУЧАСЬЦЮ АСУДЖАЮЦЬ ТЫХ,** хто невыкананьне прамфінпляну тлумачыць «аб'ектыўнымі прычынамі». Улічваючы тое, што выкананьне пяцігадовага пляну ў 3 з палов. гады па фабрыцы патрабуе напружанай работы як рабочых, так і **Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ** інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу, нарада пастанавіла абвясьціць усіх інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў **МАБІЛІЗАВАНЫМІ ДЛЯ ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВУ.**

У мэтах поўнай ліквідацыі цякучасьці сярод інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу, удзельнікі нарады далі абавязацельства **НЕ ПАКІДАЦЬ ФАБРЫКІ ДА ПОЎНАГА ВЫКАНАНЬНЯ ПЯЦІГОДКІ.**

ЖЫЛІНСКІ.

***

ІНІЦЫЯТЫЎНАЯ ГРУПА АБ'ЯДНАННАГА СХОДУ СУПРАЦОЎНІКАЎ **ЛЕСБЕЛУ** І РАБОЧЫХ ЗАВОДУ **«ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫК»,** УЛІЧВАЮЧЫ АСАБЛІВА ВАЖНАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ ДЛЯ БССР ЛЯСНОЙ ГАСПАДАРКІ І ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, І АДКАЗВАЮЧЫ НА ЗАКЛІК ЦК УсеКП(б), АБВЯСЬЦІЛА СЯБЕ МАБІЛІЗАВАНАЙ І ДАЛА АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА ПРАЦАВАЦЬ У АПАРАЦЕ ЛЕСБЕЛУ ДА КАНЦА ПЯЦІГОДКІ.

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА ДАЛІ ЧЛЕНЫ ІТС САЮЗУ ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫКАЎ Т.Т. **РОЗЭНБЛЯТ, САМОНАЎ, РУБІН, БРОМБЭРГ, АЛЬПЭРОВІЧ, БЛЯХЭР, СУЛЬСКІ, ТАЦЬЦЯНАК, ІВАНОЎ, ПЛЮТО і БЭЛЮНАС** І ВЫКЛІКАЛІ ПАСЬЛЕДВАЦЬ ІХ ПРЫКЛАДУ ЎСІХ ІНШЫХ ЧЛЕНАЎ ІТС САЮЗУ ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫКАЎ ЯК НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ, ТАК І ВА ЎСТАНОВАХ.

***

Канфэрэнцыя ўдарнікаў бабруйскага камбінату ў копькасьці **180 чал.** абвясьціла сябе мабілізаванай на ліквідацыю прарываў і дала абавязацельства не пакідаць прадпрыемства да канца пяцігодкі.

На 49.000 рублёў павялічылі свой плян шчотачнікі

Заўчора ў клюбе друкароў адбылася канфэрэнцыя рабочых шчотачнай фабрыкі імя Крупскай, прысьвечаная зацьвярджэньню сустрэчнага прамфінпляну.

Сустрэчны прамфінплян рабочых шчотачнай фабрыкі павялічвае кантрольныя лічбы з 2.393.000 руб. да 2.442.000 руб., г. зн. **на 49.000 руб.** Прадукцыйнасьць працы ў параўнаньні з кантрольнымі лічбамі павялічваецца **на 2,5 проц.,** сабекошт, замест 8,8 проц., будзе зьніжан **на 10,6 проц.**

Сустрэчны прамфінплян пабудаваны на падставе **137 рабочых прапаноў,** з якіх 134 прапановы **ўжо адабраны і перададзены майстрам для выкананьня.**

Рабочыя далі абяцаньне поўнасьцю выканаць сустрэчны прамфінплян. Камсамольская ячэйка абвясьціла сябе мабілізаванай на выкананьне прамфінпляну. 120 камсамольцаў і 357 рабочых і работніц далі абавязацельства не пакідаць фабрыкі да канца пяцігодкі. 125 новых рабочых арганізаваліся ва ўдарныя брыгады **імя трэцяга году пяцігодкі.**

На гэтым-жа вечары рабочыя — т.т. **Зарэцэр, Савінскі, Радкевіч, Шнэйдэр, Міклашэўскі, Баркун, Крэйндзль і Несьвіжскі,** якія далі лепшыя прапановы, былі **прэміяваны.**

У спрэчках, апрача рабочых і работніц т.т. **Калера, Кугель, Ушаковай,** таксама выступіў сакратар Фрунзаўскага раёну тав. **Пятушкоў,** які заклікаў рабочых фабрыкі поўнасьцю выканаць прамфінплян 1930-31 году.

У сваёй рэзалюцыі рабочыя абяцаюць прыкласьці ўсе намаганьні для выкананьня сустрэчнага прамфінпляну і цавесьці рашучую барацьбу з лятупамі.

Ц.



Машыністы Менскага дэпо т. **ПАМЯРАНСКІ** вынайшаў удасканаленьне калосьнікавай рашоткі на паравозах сэрыя ОВ. Удасканаленьне значна палягчае ачыстку топак ад шлака. Удасканаленьне будзе каштаваць усяго 80 руб.

Даць „Ударніку" варштаты

Трыкутніку і рабочым заводу „Энэргія", рэдакцыі газэта „Зьвязда"

Праз два тыдні пачынаецца новы гаспадарчы год, які на нас накладае вельмі адказныя абавязкі перад партыяй і ўсёй рабочай клясай па выкананьні прамфінпляну 1930-31 году. Новы прамфінплян, у параўнаньні з прамфінпляном бягучага году, дае павялічэньне прадукцыі **НА 110 ПРОЦ.** Між тым, новы год можа застаць нас зусім непадрыхтаванымі з-за недахвату некаторага абсталяваньня. Напрыклад, ня гледзячы на шматлікія пастановы вытворчых нарад аб хутчэйшым сканчэньні заказаных на вашым заводзе пад'ёмнікаў, гэтых пад'ёмнікаў яшчэ нама.

Ня меншай пагрозай выкананьню прамфінпляну зьяўляецца адсутнасьць прэса, які павінен быў быць перададзены нам заводакіраўніцтвам «Энэргіі», згодна дагавору, але да гэтага часу не перададзены.

Мы, рабочыя вагавага цэху, дэталёва азнаёміўшыся з адозвай ЦК УсеКП(б), лічым сябе мабілізаванымі для 100-процантнага выкананьня прамфінпляну 1930-31 году і выкананьня пяцігодкі за чатыры гады і зварачаемся да вас з просьбай, як мага хутчэй зрабіць для нас пад'ёмнікі і перадаць нам вельмі патрэбны прэс.

З таварыскім прывітаньнем рабочыя вагавага цэху заводу «Ударнік».

На раённых партканфэрэнцыях

ЦК КП(б)Б і газэце „Зьвязда"

VI па-зачарговая партыйная канфэрэнцыя Гомельскага раёну шле палкае прывітаньне свайму Ленінскаму ЦК і Цэнтральнаму Органу—«Зьвязьдзе».

Мы запэўняем, што пасьпяхова скончым другі год пяцігодкі, будзем змагацца за сустрэчны бальшавіцкі прамфінплян, плян трэцяга году. Наша арганізацыя, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, будзе рашуча змагацца за правядзеньне ўсіх дырэктыў партыі, за правядзеньне бальшавіцкай сяўбы, стане на чале кіраўніцтва новай хваляй калектывізацыі.

Дамо рашучы адпор праваму апартунізму, як галоўнай небясьпецы на даным этапе, і рэшткам контр-рэвалюцыйнага трацкізму.

Мы прыложым усе сілы да бальшавіцкай мабілізацыі ўсіх сродкаў і сіл на пасьпяховае выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, на рашучае наступленьне сацыялізму па ўсім фронце.

ПРЭЗЫДЫУМ ГОМЕЛЬСКАЙ РАЁННАЙ ПАРТЫЙНАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ.

Гомельская вясковая

14-га верасьня закончыла сваю работу пазачарговая партыйная канфэрэнцыя **Гомельскага сельскага раёну.**

У сувязі з далучэньнем да гэтага раёну буйнейшай папяровай фабрыкі **«Гэрой Працы»** (Добруш) арганізацыя налічвае звыш 800 членаў і кандыдатаў КП(б)Б.

Канфэрэнцыя абмеркавала даклад тав. **Мазура** аб чарговых задачах арганізацыі. Ва ўмовах раёну адным з галоўнейшых вучасткаў работы ў галіне прамысловасьці зьяўляюцца цагельні. Між тым становішча з выкананьнем прамфінпляну на гэтых цагельнях зьяўляецца абураючым. На трох цагельнях, прадукцыя якіх ідзе выключна для прамысловай будаўніцтва, недавыканана 12.400.000 шт. цэглы і на клінкерным заводзе цэгла, якая ідзе на дарожнае будаўніцтва, недавыпрацавана на 2 млн штук. У выніку краіна не атрымала 14.400.000 шт. цэглы.

Такое становішча зьяўляецца вынікам таго, што прафарганізацыі гэтых заводаў не павярнуліся тварам да вытворчасьці, ня сталі на чале арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцкага руху. Кіраўніцтва партыйнымі ячэйкамі мінулага райкому КП(б)Б было зусім невыстарчальным. Яшчэ і да гэтага часу ідуць вялікія спрэчкі паміж сілікатным трэстам, які арганізаваўся ў Гомелі, і Гомжылсаюзам аб тым, хто павінен кіраваць цагельнямі. З-за гэтых спрэчак свячасова на цагельні не далі патрэбнага матар'ялу (рэяк, цьвікоў, дошак і г. д.) і заводы вымушаны былі зрабіць значныя прастоі. Партыйная канфэрэнцыя запрапанавала парт'ячэйкам цагельняў узяць бальшавіцкія тэмпы ў рабоце, мабілізаваць усіх рабочых на ліквідацыю прарываў. Краіна павінна атрымаць усю цэглу, вызначаную вытворчай праграмай.

Канфэрэнцыя зьвярнула ўвагу і па іншыя важнейшыя вучасткі работы.

Так, заданьне па збожжазагатоўках выкананa толькі на 32 проц., пазыка «Пяцігодка—за чатыры гады» з заданьня ў 99.000 руб. распаўсюджана **сярод сялянства** ўсяго на 367 руб., па раёне не спагнана вялікая запазычанасьць па самаабкладаньні, страхоўцы, с.-г. крэдыце і г. д. на суму 86.010 руб.

Зусім небясьпечна з асеньняй сяўбой. Так у большасьці саўгасаў і калгасаў толькі канчаецца ўборачная кампанія, у той час, як адзіначасобнікі пачалі ўжо сяўбу. Зусім марудна праходзіць сілаваньне, а ў некаторых мясцох нават ня ведаюць, што гэта за сілаваньне.

Наглядаецца скрыўленьне клясавай лініі ў вылічэньні с.-г. падатку. Так, у прыгараднай вёсцы селянін, які мае 3-х кароў, 2 коняй і 16 дзесяцін зямлі быў вызвалены ад с.-г. падатку, як малазаможны. Дэлегатамі канфэрэнцыі паказваўся не адзін такі прыклад. Зараз у раёне налічваецца 25 калгасаў, якія аб'яднаюць 1.173 гаспадаркі з плошчай у 4.623 дзесяціны.

У сваіх пастановах партыйная канфэрэнцыя патрабавала: вялікай напружанасьці, выразна наладжанай работы ўсіх звеньняў хуткай перабудовы работы ўсіх арганізацый на баявыя бальшавіцкія тэмпы, ліквідацыі прарываў у выкананьні прамфінпляну, стаць на чале новай хвалі прыліву ў калгасы, весьці бязьлітасную барацьбу з правым апартунізмам як у тэорыі, так і на практыцы і з рэшткамі контрэвалюцыйнага трацкізму.

Канфэрэнцыя выбрала РК КП(б)Б у складзе 29 членаў і 9 кандыдатаў і РКК у складзе 15 членаў.

Сакратаром РК выбраны т. **Мазур,** старшынёй РКК выбраны т. **Пасюкевіч.**

У час канфэрэнцыі Эрамцінскі с.-с. арганізаваў чырвоны абоз збожжа ў 25 тон.

В. Л.

Кантрольныя лічбы —да кожнага рабочага

Сустрэчны прамфінплян **на віцебскай гарбарні** яшчэ ня ўсімі рабочымі прапрацаваны. Між тым, 15 верасьня прамфінплян павінен быць прадстаўлены адміністрацыі. Трэба дабіцца, каб **кожны рабочы добра ведаў кантрольныя лічбы і прыняў актыўны ўдзел у «сустрэчным»,** нават, калі трэба будзе, адцягнуць прапрацоўку яшчэ на пару дзён.

Значны штурмок прапрацоўцы сустрэчнага прамфінпляну дала адозва ЦК УсеКП(б). Адозва была прапрацавана на ўсіх зьменавых сходах. У сваёй рэзалюцыі рабочыя абавязаліся выпусьціць **звыш праграмы 30 партый скур** на 75.000 руб.

У адказ на рост цякучасьці рабочай сілы (за апошні месяц прынята 98 рабочых, звольнілася 47), што зьяўляецца **аднэй з прычын прарыву ў выкананьні жнівеньскай праграмы амаль на 20 проц.,** рабочыя далі абавязацельства **застацца на заводзе да канца пяцігодкі.** Вось, напрыклад, што піша рабочы тав. **Шэйкман:**

«Я, рабочы чырвонадубнага цэху, працую на заводзе з 1921 году і паступіў на гарбарню ў той момант, калі рабочая кляса пачала новае, сьветлае жыцьцё. Мы маем рад труднасьцяй і павінны іх калектыўна зьнішчыць. Самае ганебнае, што тармозіць выкананьне прамфінпляну на нашым заводзе — гэта цякучасьць рабочых. Я буду працаваць на гарбарні да таго часу, пакуль у мяне хопіць сіл».

Такіх заяў падана многа. Яны даюць гарантыю, што гарбарня пераможа ўсе труднасьці, якія перад ёй стаяць.

С. Ф.

ДНІ БАЯВОЙ ТРЫВОГІ

4-га верасьня рабочыя запалкавых фабрык «Пралетарская Перамога» і «Чырвоная Бярэзіна» атрымалі газэты з апублікаванай адозвай ЦК УсеКП(б).

8-га верасьня сабраўся сход партактыву абедзьвюх фабрык для абгаварэньня мер па ажыцьцяўленьні дырэктыў пленінскага ЦК. Дзень 8-га верасьня зьявіўся днём баявой трывогі, СХОД АБВЯСЬЦІЎ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЮ ФАБРЫКІ МАБІЛІЗАВАНАЙ ДА 1-га КАСТРЫЧНІКА НА ЛІКВІДАЦЫЮ ПРАРЫВАЎ. УСІМ КАМУНІСТЫМ І КАМСАМОЛЬЦАМ ЗАБАРОНЕНЫ АДПУСКІ. Кожны з адказных гаспадарчых работнікаў атрымаў баявое заданьне з дакладным вызначэньнем тэрмінаў выкананьня.

— На працягу 30 гадз. ліквідаваць перабоі ў шчапальным цэху, шляхам неадкладнай падвозкі асіны.

— ПРЫНЯЦЬ ТЭРМІНОВА МЕРЫ ДА ПАВЯЛІЧЭНЬНЯ І ПАЛЯПШЭНЬНЯ ТРАНСПАРТУ.

— ПРАЗ 12 ГАДЗІН УСТАНАВІЦЬ ВУЗКАКАЛЕЙКУ АД ШЧАПАЛЬНАГА ЦЭХУ.

На загадчыкаў цэхамі ўскладзена пэрсанальная адказнасьць за ход работы ў цэхах.

ФАБРЫКА «ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА» ПАВІННА ДАЦЬ 120 ТУЗІН ВАТЭРПАСАЎ, 560 СКРЫНЬ ЗАПАЛАК У ЗЬМЕНУ, І НІ АДНЭЙ СКРЫНЯЙ МЕНШ.

Для выкананьня гэтай баявой задачы павінна быць зроблена ўсё магчымае.

Фабрыцы «Пралетарская Перамога» трэба забясьпечыць усе ўмовы для выпрацоўкі 840 скрынь у зьмену. КОЖНЫ КАМУНІСТЫ АТРЫМЛІВАЕ КАНКРЭТНЫЯ ЗАДАНЬНІ ПА ПАВЯЛІЧЭНЬНІ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦІ ПРАЦЫ.

Той не камуністы, хто знаходзіцца па-за ўдарнай брыгадай, хто ня прымае ўдзелу ў сацспаборніцтве.

Абвешчана самая суровая барацьба рвачам і пятунам, якія падрываюць вытворчасьць. Устанаўляюцца прэміі рабочым, якія працуюць на фабрыцы з пачатку пуску і далі абавязацельства не пакідаць фабрыкі да канца пяцігодкі.

Арганізуюцца брыгады па папяшэньні работы сталоўкі.

1-га кастрычніка склікаецца агульнафабрычны зьлёт ударнікаў для праверкі выкананьня баявога заданьня.

Б—ў.

10,000 чал. на курсах па падрыхтоўцы ў ВНУ

Прэзыдыум ЦСПСВ заслухаў даклад Наркамасьветы аб пэрспэктывах новага навучальнага году. У 1931 годзе вызначаны прыём у ВНУ БССР у 5.300 чал., у тэхнікумы і прафшколы—23.000 чал. Рабфакі і сярэднія навучальныя установы дадуць для ВНУ 2.000 чал., для тэхнікумаў і прафшкол 17 тысяч чал., што не забясьпечвае выкананьня вызначанай нормы.

Прэзыдыум ЦСПСВ згадзіўся з прапановай Наркамасьветы аб арганізацыі пры навучальных установах сеткі курсаў па падрыхтоўцы ў ВНУ. Праз гэтыя курсы будзе пралупчана да 10.000 чал., пераважна рабочых, дзяцей рабочых, батракоў, беднякоў і сераднякоў.

Да ліквідацыі акруг

ПРАЯВАЙ АПАРТУНІЗМУ

зьяўляецца нежаданьне па-бальшавіцку выконваць дырэктывы партыі аб узмацненьні раёнаў

Аб ходзе ліквідацыі акруг

Пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і калегіі НК РСІ

1) Ня гледзячы на рад катэгарычных дырэктыў вышэйшых партыйных і савецкіх органаў, работа па ліквідацыі акруг праходзіць нездавальняюча, вельмі маруднымі тэмпамі.

Цэнтральныя ўстановы абмежаваліся фармальным правядзеньнем рэарганізацыі свайго апарату, не нападзілі непасрэднае сувязі і кіраўніцтва раёнамі, з некаторымі раёнамі на працягу 2-х месяцаў няма ніякай сувязі, што асабліва небясьпечна ў сучасны момант, калі праводзіцца рад палітычна-гаспадарчых кампаній (збожжазагатоўкі, сяўба і г. д.). Да раёнаў да гэтага часу яшчэ не даведзены некаторыя пляны, што пагражае свячасовай распрацоўцы кантрольных лічбаў і бюджэтаў на 1930-1931 год.

Рад канкрэтных даручэньняў Ураду аб распрацоўцы зьмен у законадаўстве і Палажэньне пра мясцовыя органы ў сувязі з ліквідацыяй акруг — да гэтага часу большасьцю наркаматаў і цэнтральных устаноў ня выкананы, што ўносіць блытаніну ў працу мясцовых і цэнтральных устаноў.

2) Груба парушаецца важнейшая дырэктыва партыі АБ УМАЦАВАНЫМІ РАЁНАЎ КАДРАМІ. Частка членаў партыі пад усякімі прычынамі адцягвала выезд, а ў паасобных выпадках зусім адмаўляецца ад выезду ў раёны (дэзэртыры). Яшчэ горш справа з ўкамплектаваньнем раёнаў спэцыялістымі і бухгальтарска - рахунковым пэрсаналам —некаторыя раёны не ўкамплектаваны на 50 і больш процантаў.

Частка былых акруговых работнікаў асядае ў гарадох і ў бліжэйшых раёнах гарадзкога тыпу.

Замест таго, каб садзейнічаць накіраваньню работнікаў у раёны, некаторыя наркаматы і цэнтральныя установы (Наркамзем, Наркамфін, Белсельснаб, і інш.) заняліся перамакваньнем работнікаў у цэнтральны апарат.

3) Гаспадарчыя органы з вялікім спазьненьнем прыступілі да распрацоўкі праектаў рэарганізацыі і да гэтага часу яшчэ ня маюць выразнай структуры рэарганізацыі свайго апарату (Белмяса, Саюзхлеб, Дзяржгандальбеп і інш.), а частка цэнтральных устаноў (Белдзяржбуд, Беллайгандаль, Белдзяржвыдавецтва і інш.) нават не пачалі думаць, што ім трэба рабіць у сувязі з ліквідацыяй акруг.

Пры распрацоўцы праектаў рэарганізацыі, гаспадарчыя органы не зразумелі асноўных прыкцыпаў ліквідацыі акруг і замест перадачы функцый і правоў акруговых органаў раёнам і ўмацаваньня раёнаў, «як асноўнага зьвяна сацыялістычнага будаўніцтва» — праявілі тэндэнцыю пад рознымі шыльдамі пакінуць акругі, або стварыць буйныя міжраённыя цэнтры (у былых павятовых гарадох).

4) Раённыя арганізацыі не падрыхтаваліся да перабудовы свайго апарату і працы ў адпаведнасьці і з вучотам задач, што ўскладаюцца на раён у сучасны момант і ў радзе выпадкаў праявілі дэмабілізацыйныя настроі, якія ў значнай частцы адмоўна адбіліся на працы раённага апарату.

Раённыя арганізацыі таксама аказаліся непадрыхтаванымі і не стварылі адпаведных умоў для працы пашыранаму складу раённага апарату, у сувязі з чым шмат работнікаў, накіраваных у раёны, доўгі час ня былі правільна скарыстаны. Нанава арганізаваным раённым установам і перакінутым работнікам ня былі забясьпечаны нармальныя ўмовы для працы.

5) Прафсаюзы, асабліва саюзы саўгандальслужачых і сельгаспрацоўцаў, не зразумелі палітычнага значэньня ліквідацыі акруг і не мабілізавалі саюзную масу на канкрэтную дапамогу перабудове і ўзмацненьню раённага апарату, на садзейнічаньне правільнаму разьмеркаваньню і перакідцы работнікаў у раёны.

Выходзячы з вышэйпаказанага, Прэзыдыум ЦКК і Калегія РСІ пастанаўляюць:

1) Папярэдзіць усе цэнтральныя ўстановы, што ўсякае праяўленьне маруднасьці і беспадстаўную адтяжку па правядзеньні практычных мерапрыемстваў, зьвязаных з ліквідацыяй акруг, — ЦКК-РСІ будзе разглядаць як нежаданьне па-баявому выконваць важнейшую дырэктыву партыі і як праяўленьне правага апартунізму на практыцы.

2) Абавязаць усе цэнтральныя ўстановы, пад асабістую адказнасьць іх кіраўнікоў, на працягу дзкады распрацаваць рад канкрэтных мерапрыемстваў па ўзмацненьні непасрэднай сувязі з раёнамі, па арганізацыі і правільным нападжваньні інструктаваньня і дапамогі раёнам, па арганізацыі кароткатэрміновых курсаў або нарад, па інструктаваньні накіраваных у раён работнікаў і г. д.

3) Запрапанаваць усім цэнтральным установам, якія да гэтага часу яшчэ ня выканалі даручэньняў Ураду аб распрацоўцы Палажэньняў пра мясцовыя органы і зьмене законадаўства ў сувязі з ліквідацыяй акруг — выканаць гэтыя даручэньні на працягу 5-ці дзён. Адначасова даць тлумачэньне ЦКК-РСІ аб прычынах невыкананьня гэтага і паведаміць аб тых, хто вінаваты ў невыкананьні паказаных даручэньняў.

4) Даручыць упаўнаважанаму НК Шляхоў Зносін разам з зацікаўленымі гаспадарча - каапэрацыйн. арганізацыямі на працягу 2-х дзкад распрацаваць пытаньне паляпшэньня арганізацыі транзыту тавараў непасрэдна ў раёны.

5) ВСНГ неадкладна праверыць выкананьне акруговымі ліквідацыйнымі камісіямі дырэктыў Ураду аб перадачы раёнам і Гарсаветам прадпрыемстваў мясцовай прамысловасьці, а таксама распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па ўзмацненьні і набліжэньні кіраўніцтва рэспубліканскай і мясцовай прамысловасьцю з боку мясцовых кіраўнічых органаў.

6) У сувязі з адсутнасьцю эканамічна - статыстычных паказальнікаў, якія характарызуюць гаспадарчае становішча раёнаў у сучасны момант, даручыць Дзяржпляну распрацаваць рад канкрэтных мерапрыемстваў, якія забясьпечвалі-б этрыманьне малюнку фактычнага эканамічна - статыстычнага становішча раёнаў у сучасны момант.

Даручыць Савецкай Групе праверыць, як падрыхтаваліся Дзяржплян і ўсе ведамствы да распрацоўкі кантрольных лічбаў і плянаў у раённым разрэзе і якую канкрэтную дапамогу яны аказваюць раёнам у гэтым пытаньні.

7) Абавязаць Наркампрацы на працягу 5-ці дзён зацьвердзіць уніфіцыяваныя стаўкі для ўсіх раённых гаспадарчых органаў.

8) Белдзяржвыдавецтву арганізаваць выданьне масавай літаратуры па папулярызацыі пытаньняў, зьвязаных з ліквідацыяй акруг.

9) Улічваючы важнейшае значэньне арганізацыі раённых кас ашчаднасьці, паставіць перад Беларускім Кіраўніцтвам кас ашчаднасьці, як баявую задачу арганізацыю райкас ва ўсіх раёнах.

Органам КК-РСІ прыцягваць да судовай адказнасьці ўсіх тых, якія перашкаджаюць выкананьню гэтай дырэктывы.

10) Улічваючы невыстарчальную сувязь з раёнамі і маруднасьць, якая праяўляецца органамі Сувязі па ўзмацненьні ўсіх відаў сувязі з раёнамі, даручыць Транспартнай Групе неадкладна праверыць, што зроблена ў гэтай галіне і вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы па нападжваньні сувязі з раёнамі.

11) Абавязаць усе Райвыканкомы і раённыя арганізацыі неадкладна разгарнуць працу па стварэньні ўмоў для працы раённых устаноў.

12) Паказаць усім ліквідкомам на нерацыянальнае разьмеркаваньне, а ў некаторых выпадках разбазараньне маемасьці і спэцыяльных інструмантаў, запрапанаваўшы ім ужыць рашучыя захады па зьнішчэньні гэтых недахопаў.

13) Абавязаць францыі ЦП прафсаюзаў саўгандальслужачых і Сельгаспрацоўцаў неадкладна разгарнуць сапраўдную практычную дапамогу па ўмацаваньні раёнаў і мабілізацыі саюзнай масы вакол пытаньняў, зьвязаных з ліквідацыяй акруг. У прыватнасьці пічыць неабходным тэрмінова мабілізаваць грамадзкую думку і ўзьняць хвалю грамадзкага ганьбаваньня супроць усіх дэзэртыраў і тых, хто адмаўляецца ад паездкі ў раёны.

14) У мэтах высьвятленьня фактычнага становішча ў раёнах, праверкі правільнага разьмеркаваньня работнікаў і сапраўднага іх знаходжаньня на працы ў раёнах—даручыць Савецкай Групе разам з Аргаддзелам ЦВК правесьці масавае абсьледаваньне 20-25 раёнаў, мабілізаваўшы на гэту працу адпаведную колькасьць работнікаў цэнтральных устаноў.

Да суровай адказнасьці—за перамаўваньне акруговых работнікаў

Пастанова ЦКК КП(б)Б

1) Канстатаваць, што факты, прыведзеныя за апошні час у друку (газ. «Зьвязда», «Савецкая Беларусь») аб перамаўваньні цэнтральнымі ўстановамі раду работнікаў з ліквідаваных акруговых устаноў, у асноўным пацьвердзіліся.

2) За зусім недапушчальныя дзеяньні Наркамфіну ў перацягваньні акруговых работнікаў у цэнтральны апарат (патрэба ньне НКФ аб накіраньні ў цэнтральны апарат раду работнікаў Акрфа, прыём на работу значнай колькасьці работнікаў з Менскага Акрфа, перамаўваньне на работу статыстыка Аршанскага Акрфа Турэнко і г. д.), што перашкаджала ўмацаваньню раённага апарату — наркому фінансаў т. **Мікулічу** і сакратару Наркамату т. **Спарыхіну** абвясьціць вымову.

3) За недапушчальныя факты перацягваньня акруговых зямельных работнікаў у цэнтральны апарат Наркамзему (перавод на работу ў Наркамзем Вінебскага акр. зямляўпарадкавацеля т. Чэрняка паперакор пастанове акруг. ліквід. камісіі і інш.) кіраўніку сэктару зямляўпарадкаваньня НКЗ т. **Вайцэховічу** абвясьціць вымову.

4) Адзначыць бюракратычны падыход з боку НКЗ да пытаньня ўмацаваньня раёнаў (запатрабаваньне копій прапоўных сьпісаў і службовых характарыстык на ўсіх сельска - гаспадарчых спэцыялістых ва ўсёй БССР), што зусім правільна выклікала абурэньне акруг. ліквід. камісій і запрапанаваць Наркамзему т. Рачыцкаму накласьці адміністрацыйнае спагнаньне на вінаватых у гэтым асоб.

5) За перацягваньне на працу ў цэнтральны апарат Белсельгасснабу акруговых работнікаў і абсалютнае неразуменьне з боку кіраўніцтва Белсельгасснабу задач па ўмацаваньні раёнаў (хадайніцтвы і скаргі ў НК РСІ на тое, што акругі не адпушчаюць работнікаў у цэнтральны апарат, а накіроўваюць іх у раёны) кіраўніку Белсельгасснабу т. **Тапаніна** абвясьціць вымову.

6) Паказаць загадчыку вучраўмерку ВСНГВ т. **Скараходу** на недапушчальныя формы перамаўваньня работнікаў Вінебскага і Гомельскага Акрпляну (асабістыя запрашэньні гэтым работнікам).

7) Папярэдзіць кіраўнікоў усіх устаноў, што ўсякае перамаўваньне работнікаў ліквідаваных устаноў, або з раёнаў,—ЦКК РСІ будзе разглядаць як пералікоду выкананьню дырэктыў па ўмацаваньні раёнаў і прыцягваць вінаватых да суровай адказнасьці.

8) ЦКК-РСІ зварачаецца да ўсіх грамадзкіх арганізацый і рабселькораў з просьбай выкрываць праз друк усе выпадкі перамаўваньня акруговых работнікаў.

Да ліквідацыі акруг

Пастанова ЦВК БССР

Праз 2 тыдні пачынаецца новы гаспадарчы год, які на нас накладае вельмі адказныя абавязкі перад партыяй і ўсёй рабочай клясай па выкананьні прамфінпляну 1930-31 году. Новы прамфінплян, у параўнаньні з прамфінпляном бягучага году, дае павялічэньне прадукцыі **НА 110 ПРОЦ.** Між тым, новы год можа застаць нас зусім непадрыхтаванымі з-за недахвату некаторага абсталяваньня. Напрыклад, ня гледзячы на шматлікія пастановы вытворчых нарад аб хутчэйшым сканчэньні заказаных на вашым заводзе пад'ёмнікаў, гэтых пад'ёмнікаў яшчэ нама.

Ня меншай пагрозай выкананьню прамфінпляну зьяўляецца адсутнасьць прэса, які павінен быў быць перададзены нам заводакіраўніцтвам «Энэргіі», згодна дагавору, але да гэтага часу не перададзены.

Мы, рабочыя вагавага цэху, дэталёва азнаёміўшыся з адозвай ЦК УсеКП(б), лічым сябе мабілізаванымі для 100-процантнага выкананьня прамфінпляну 1930-31 году і выкананьня пяцігодкі за чатыры гады і зварачаемся да вас з просьбай, як мага хутчэй зрабіць для нас пад'ёмнікі і перадаць нам вельмі патрэбны прэс.

З таварыскім прывітаньнем рабочыя вагавага цэху заводу «Ударнік».

ПАЧАЎСЯ ПРЫЗЫЎ 1908 году

Яшчэ ёсьць час выправіць недахопы падрыхтоўкі да прызыву

Першы дзень прызыву

Чыстае памяшканьне прызыўнога пункту радуе зрок. Белыя сьцены адліваюць сінявой. На сьцяне плякаты—«Чырвоная армія—узброены атрад рабочай клясы».

У ленінскім кутку за часопісямі і газэтамі сядзяць прызыўнікі. На тварах няма турботнага чаканьня. Вясёлы сьмех часта перапыняе цішыню. Моладасьць і сіла грае на твары.

1908 год!

У пакоі перад уваходам у камісію прызыўнікі распранаюцца. У наступным пакоі прызыўнікоў узважваюць і вымяраюць, тут вага і рост ператвараюцца ў лічбы, якія запісваюцца на паперы і сьведчаць аб ступені годнасьці прызыўніка. Перад камісіяй—работы заводу «Энэргія».

У яго вузкая грудная клетка. Урач зварачае на гэта ўвагу камісіі. Але энэргавец ня хоча слухаць аб нейкай хваробе.

— Ну, што-ж калі грудная клетка вузкая—глупства. Уеўроўна хачу служыць. Даічэчым тонам сказанае «уеўроўна», выклікае сьмех членаў камісіі.

Камісія аглядае прызыўніка

Перад камісіяй другі прызыўнік.

— Хворы—кажа урач.

— Як хворы, я здаровы, я хачу служыць у Чырвонай армі. Ён з трывогай глядзіць на доктара. Не, ня можа быць, каб ён быў хворы. І толькі слова «годны» выклікае спакойную ўсьмешку.

Так, адзін за адным штодзённа пройдуць перад камісіяй прызыўнікі.

Стол даведак, ленінскі куток, ларок, бібліятэка—усё да паслуг прызыўніка. Будучы чырвонаармеец ужо з пачатку акружаецца клапатлівасьцю, якая будзе яго суправаджаць да канца службы ў радах Чырвонай арміі.

Яз. С.

Прызыў сустрэлі падрыхтаванымі

Падрыхтоўчая работа да прызыву 1908 г. на Блоньскім сельсавеце, Пухавіцкага раёну распачалася загадзя. Прызыўнікі да прызыву на сельсавеце падрых

НА ФРОНТ!

У РАШАЮЧЫЯ БАІ ЗА КОЖНЫ ГА ЎРАДЖАЮ

Апартуністычнае кіраўніцтва Полацкага райкалгассаюзу ставіць пад пагрозу асеньнюю сяўбу

НІ АДЗІН ГА

не павінен быць

НЯУБРАНЫМ і НЕЗАСЕЯНЫМ

Пастанова Белкалгасцэнтру

Заслухаўшы зводку і паасобныя даклады аб ходзе ўборкі ўраджаю і сяўбы азімых, праўленьне Белкалгасцэнтру пастанаўляе:

1. Адзначыць, што па радзе раённаў уборка ўраджаю ганебна зацягнулася. **Тысячы гэктараў сенажаці і збожжавых культур, асабліва тэхнічных, знаходзяцца пад пагрозай поўнага зьнішчэньня.**

Ня гледзячы на рад катэгарычных дырэктыў, пасылку па месцы прадстаўнікоў цэнтральных установаў (НКЗ, БКЦ і інш.) калгасы і раённыя саюзы яшчэ не пераключыліся на баявыя тэмпы работы па разгортваньні сяўбы азімых, арганізацыі насенных фондаў і г. д.

2. За поўную непадрыхтаванасьць да правядзеньня ўборачнай кампаніі і асеньняй сяўбы, за невыкананьне важнейшых дырэктыў партыі і ўраду і Белкалгасцэнтру па ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніях, разьмеркаваньні ўраджаю і хлебазагатоўках, — **прыцягнуць да суровай адказнасьці Бягомльскі райкалгассаюз,** перадаўшы паяўныя матэрыялы па Бягомльскім раёне пракурору рэспублікі.

Пленчаніцкаму Райкалгассаюзу **абвясьціць вымову** за несваячасовае правядзеньне дырэктыў Белкалгасцэнтру па ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніях, разьмеркаваньні ўраджаю і хлебазагатоўках, — **прыцягнуць да суровай адказнасьці Бягомльскі райкалгассаюз,** перадаўшы паяўныя матэрыялы па Бягомльскім раёне пракурору рэспублікі.

Пленчаніцкаму Райкалгассаюзу **абвясьціць вымову** за несваячасовае правядзеньне дырэктыў Белкалгасцэнтру па ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніях. Прасіць пленчаніцкі РВК узмацніць райкалгассаюз адказнымі працаўнікамі.

Найпрэдзіць праўленьні ўсіх райкалгассаюзаў і калгасных сэкцый райкаапсаюзу аб іх **суровай адказнасьці** за правядзеньне асеньняй сяўбы і ўборкі збожжавых і тэхнічных культур.

3. Прасіць ЦКК-НК РСІ даць паказаньні сваім раўчуўноваважаным тэрміновага праверыць выкананьне дырэктыў ЦК КП(б)Б ураду і Калгасцэнтру з боку райкалгассаюзаў і калгасных сэкцый, а таксама дзейнасьць усіх камандыраваных у раёны прадстаўнікоў цэнтральных установаў (НКЗ, калгасна-каапэрацыйных саюзаў) на правядзеньне ўборачнай кампаніі, сяўбы азімых і хлебазагатовак.

БЕЛКАЛГАСЦЭНТР.

ТРАКТАРЫ БЯЗ ШКІВАЎ

МАЛАТАРНІ БЕЗ ПРЫВАДОЎ

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Тэмпы сяўбы на Гомельшчыне да гэтага часу далёка **НЕВЫСТАРЧАЛЬНЫЯ.** У шмат якіх раёнах уборка ўраджаю зацягнулася, што тармозіць сяўбу азімых. Абмалот ураджаю, як правіла, **НЕ АРГАНІЗАВАНЫ.** У прыватнасьці недапушчальна зацягвацца ўборка і зрывацца абмалот у Брагінскім і Хойніцкім раёнах. **Звыш 500 тон неабмалочанага жыта ў Брагінскім раёне ляжыць пад адкрытым небам і псуецца.** Абмалот не наладжаны з прычыны поўнай адсутнасьці малатарань. Паляводсаюз прыслаў у раён **5 паўскладаных малатарань, але ў іх няма... прывадоў.** Прысланы таксама **5 трактараў без... шківаў.** Раённы камітэт партыі і райкалгассаюз ня кіруюць уборачнай кампаніяй і падрыхтоўкай да сяўбы.

Паранейшаму ў шмат якіх мясцох злачынна не скарыстоўваецца ўтнаньне. На чыгуначнай станцыі Хойнікі ляжаць сотні тон вапны. Частка вапны начала ўжо псавацца. На станцыі Уза стаіць вагон суперфасфату. Райкалгассаюз нічога не зрабіў, каб перакінуць гэты суперфасфат у калгасы.

У Лоеўскім раёне некаторыя калгасы-нікі і адзіначсобнікі прыступілі да сяўбы, не падрыхтаваўшы насеньня. У Бывалькаўскім сельсавеце, Лоеўскага раёну, абоз стаіць без усякага руху. Між тым, калгасьнікі і адзіначсобнікі прымушаны сеючь неачышчаным насеньнем.

Вязынь-Фаніпаль трэба аздаравіць

САМАХВАЛАВІЧЫ. Год таму назад саўгас **«ВЯЗЫНЬ-ФАНІПАЛЬ»** вызваліўся ад шайкі былых дзянікінскіх і калчакаўскіх афіцэраў, якія разбурылі гаспадарку. Белсельтрэст і раённыя арганізацыі павінны былі аддаць самую сур'ёзную ўвагу аздараўленьню і разьвіцьцю саўгасу. Гэтага якраз няма. Становішча саўгасу на сёнешні дзень выклікае сур'ёзную трывогу.

Саўгас мае 2.000 га пахаці і каля 1.000 галоў буйное жывёлы. Вязынь-Фаніпаль павінен стаць вялікай малочнай фэрмай. На жаль, у саўгасе заўважваюцца агідныя непаладкі і безгаспадарчасьць. 700 добрых племянных кароў стаяць пад адкрытым небам: скотныя двары не пабудаваны. Уборачная кампанія праходзіць зусім дрэнна. На полі стаяць 35 га пасеваў жыта, якое ўжо парасло. Шмат якія рабочыя нядбайна адносяцца да работы. Зарэгістраваны шматлікія факты недысцыплінаванасьці, п'янства, прагулаў, адмаўленьня выйсьці на работу, хуліганства і г. д. Зьдзельныя расцэнкі выпрацаваны абураюча, што выклікала рост самага агіднага рвацтва. На ўборцы аўса, напрыклад, жанчыны зараблялі да 30 руб. у дзень.

Да асеньняй сяўбы саўгас ЗУСІМ НЕ ПАДРЫХТАВАЎСЯ. Слабоўніцтва не разгорнута.

ГІЛЯРСКІ

Псуюцца сельска-гападарчыя машыны

Адносіны да сельскагаспадарчых машын у некаторых калгасах дрэнныя. Напрыклад: у калгасе **«Горацкай слабады»,** выяжджаць на работу, ня змазваюць жнівярак. У калгасе «Галадрэва» конныя граблі, вельмі патрэбныя для ўборкі, іржавеюць на калгасным двары.

У **«Шарынскім»** калгасе за гэтае лета пераставалі працаваць зусім новыя машыны: сяварка і жнівярка. Яны псуюцца таму, што стаяць пад дажджом.

Прычынай гэтага зьяўляюцца нядбайныя адносіны, як з боку саміх калгасьнікаў і праўленьня калгасу, так і Райкалгассаюзу.

Р. Т.

Узьнімаюць цаліну

Раён ганебных тэмпаў

Апартуністыя зрываюць уборку і сяўбу

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). Апартуністычная бязьдзейнасьць райкалгассаюзу ставіць пад пагрозу асеньнюю сяўбу ў раёне. Райкалгассаюз зусім ня кіруе калгасамі і ня ведае, што ў іх робіцца. Калгасы прадастаўлены самі сабе.

Уборка яравых у раёне недапушчальна зацягваецца. Ёсьць цэлы рад калгасаў, не прыступіўшых да сёнешняга дня да ўборкі яравых культур. Камуна **«Чырвоны артылерыст»** да гэтага часу ня ўбрала, каля 200 га сенажаці; калгас «Чырвоная зорка» ня ўбраў 20 га аўсу; арцелі **«Новы Шлях»** і **«Бальшавік»,** маючы па 20 га пасеваў ільну, яшчэ не прыступілі да іх уборкі. У гэтых калгасах няма патрэбных с.-г. машын і не хапае значнай колькасьці рабочых рук. Аднак, мясцовыя партыйна-камсамольскія ячэйкі і прафсаюзныя арганізацыі нічога не зрабілі, каб дапамагчы адстаючым калгасам.

Да сяўбы калгасы Полацкага раёну зусім не падрыхтаваны, за выключэньнем арцеляй «Парыская камуна» і «Авангард» ні ў адным калгасе няма пляну асеньняй пасеўнай кампаніі. Варта адзначыць, што для «Авангарда» і «Парыскай камуны» пляны сяўбы складаліся аграномам бяз усякага ўдзелу калгасьнікаў. Калгасы нічога ня ведаюць аб гэтых плянах.

Гатунковым насеньнем калгасы забясьпечаны толькі па 5 проц. пасеўнай плошчы. Райкалгассаюз ня прыняў ніякіх мер да завозу насеньня і поўнага выкарыстаньня мясцовых рэсурсаў. Асобныя калгасы ўжо пачалі сяўбу. Між тым абозы па ачыстцы насеньня яшчэ не працуюць. Да гэтага часу некаторыя калгасы ня маюць азімага кліну. Напрыклад, арцелі «Чырвоныя Ўсходы» і «Чырвоная Секароўшчына» ня маюць ніякай магчымасьці падрыхтавацца да засеву азімага кліну, бо яны яшчэ ня ведаюць, дзе будуць сеяць.

У раёне ня прынята ніякіх мер да вашчаньня і тарфаваньня глебы. У правядзеньні аграмінімуму і барацьбе за пашырэньне азімага кліну раённыя арганізацыі праяўляюць поўную бязьдзейнасьць. Гэтым карыстаецца кулацтва, якое разгортвае актыўную агітацыю ў паасобных калгасах. У калгасе «Новы шлях», напрыклад, пад уплывам кулацкай агітацыі заўважваецца масавы нявыхад на работу. У некаторых калгасах ёсьць частковы адліў (арцель «Авангард»).

Раённыя арганізацыі не даюць рашучага адпору кулацтву і не рэагуюць на ўсе гэтыя факты. У сьвятле гэтых фактаў зусім ня дзіва, што хлебазагатоўкі ў раёне яшчэ не распачаліся. Зусім відавочна, што раённае кіраўніцтва, якое зрывае ўборку, сяўбу і хлебазагатоўкі, павінна быць **АБНОЎЛЕНА.**

К—н.

Калгасы без азімага кліну

Трактары ў адпачынку

КАПЫЛЬ, 11. (Наш кар.). У Капыльскім раёне шырока разгарнулася асеньняя пасеўная кампанія. Многія калгасы і сельсаветы ўжо прыступілі да сяўбы. У ходзе сяўбы выяўляецца зусім **слабая** падрыхтоўка раённых арганізацый да пасеўнай кампаніі. У шмат якіх калгасах Капыльскага раёну да сёнешняга дня не праведзена зямляўпарадкаваньне. Ёсьць цэлы рад калгасаў, якія ня маюць да гэтага часу азімага кліну (**«Камунар», «Пераможца»** і г. д.). Асобныя сельсаветы нічога ня ўжылі, каб пашырыць пасеўную плошчу. Наяўныя магчымасьці пашырэньня пасеўнай плошчы далёка не скарыстаны. Напрыклад, у Пяшанскім сельсавеце, Капыльскага раёну **250** гэкт. добрай зямлі да гэтага часу ня ўзорана, у Ланцуцкім сельсавеце—**200** гэкт. і г. д. Часеньне яшчэ не адсартавана.

С.-г. прылады і машыны поўнасьцю не адрамантаваны. Трактары не нагружаны. Зарэгістраваны факты, калі трактары цэлымі днямі стаяць без нагрузкі. Напрыклад, у калгасе **«Ленінец»** спраўны трактар прастаяў увесь дзень бяз усякага руху.

Кантрактацыя па індывідуальным сэктары стаіць на нарсэе поўнага правалу. Раённы плян кантрактацыі выкананы толькі на **1,1 проц.**

Раённыя арганізацыі зусім дрэнна кіруюць асеньняй сяўбой. Райкалгассаюз бязьдзейнічае. Капыльскі Калгасаюз нічога ня ведае аб тым, што робіцца ў калгасах і зусім ня кіруе калгаснымі будаўніцтвам у раёне. Трэба **зьмяніць** апартуністычнае кіраўніцтва Райкалгассаюзу.

Л.

Тысячы га сенажаці, тэхнічных і збожжавых культур патрабуюць неадкладнай уборкі

Калгас імя „Зьвязды" канчае сяўбу

БАБРУЙСК. (НАШ КАР.). КАЛГАС ІМЯ ГАЗЭТЫ «ЗЬВЯЗДА» (СТАРОБІНСКІ РАЁН) БАЯВЫМ ТЭМПАМ ПРАВОДЗІЦЬ АСЕНЬНЮЮ ПАСЕЎНУЮ КАМПАНІЮ. СЯЎБА Ў КАЛГАСЕ ПАЧАЛАСЯ ЯШЧЭ 28-га ЖНІЎНЯ. ГЭТЫМІ ДНЯМІ КАЛГАС КАНЧАЕ СЯЎБУ. УСЯГО БУДЗЕ ЗАСЕЯНА 50 ГЭКТАРАЎ ЖЫТА І 10 ГЭКТАРАЎ АЗІМАЙ ПШАНІЦЫ. РАЗАМ З ГЭТЫМ КАЛГАС КАНЧАЕ ЎБОРКУ БУЛЬБЫ І СІЛАСАВАНЬНЕ КАРМОЎ, ПАБУДАВАНЫ 2 ЦЭМЭНТНА-БЭТОННЫЯ ЯМЫ НА 75 ТОН СІЛАСУ. АДНА ЯМА 5-га ВЕРАСЬНЯ ЎЖО ЗАПОЎНЕНА СІЛАСАМ. АМАЛЬ СКОНЧАНА ЗАГРУЗКА І ДРУГОЙ СІЛАСНАЙ ЯМЫ.

П. Е.

НА ШЛЯХУ ДА КАТАСТРОФЫ

Выгнаць шкоднікаў з саўгасу Рагінь

БУДА-КАШАЛЕЎСКАЯ. Наш друк ня раз сыгналізаваў аб злачынных агіднасьцях у саўгасе **РАГІНЬ.** Аднак, ніякія меры па аздараўленьні саўгасу да сёнешняга дня ня прыняты. Загадчык саўгасу Росьлік паранейшаму займаецца беспрабудным п'янствам і вядзе саўгас да поўнага развалу. Уборачная кампанія і падрыхтоўка да асеньняй сяўбы ў саўгасе злачынна сарваны.

На палёх саўгасу згніла ЎСЯ канюшына і сена. Цяпер псуецца і авёс, які ня ўбіраецца і стаіць на полі. Да асеньняй сяўбы саўгас зусім не гатоў. У саўгасе панує агідная безгаспадарчасьць. Нафтавы млын разбураецца. Кіраўніцтва саўгасу трэба неадкладна зьняць з работы і прыцягнуць да суровага адказу.

Л.

ВОСЬ, ДЗЕ НЯМА ЎДАРНІЦТВА

У камуне імя **Сталіна, Аляксандраўскага сельсавету, Гарадоцкага раёну,** уборачная кампанія праводзіцца не на ўдарнаму. Адчуваецца слабасьць дысцыпліны, нявыхад на работу, ня гледзячы на тое, што ў гаспадарцы не хапае рабочых рук. Вытворчай нарады няма. У выніку гэтага, уборка зацягваецца.

Л.

З ДЭКАДЫ НА ДЭКАДУ

Верасень 2-я ДЭКАДА
Пералому яшчэ няма

„АДКЛАДВАЮЦЬ" ХЛЕБАЗАГАТОЎЦЫ ЎЗМАЦНЕНЬНЕ ЗАГАТОВАК

Саўгасы плятуцца ў хвасьце: імі здана 4,2% пляну

32,4 проц. пляну

—вынік загатовак за 1 дэкаду верасьня

За 10 дзён верасьня ўсімі загатоўшчыкамі месячнае заданьне выкананa на 32,4 проц. Такое выкананьне пляну ўсё яшчэ нельга лічыць здавальняючым, бо гэткія тэмпы загатовак не гарантуюць пакрыцьця жнівеньскага недабору.

Усё яшчэ вельмі слаба праходзіць паступленьне збожжа па кантрактацыі, асабліва ад кантрактантаў-адзіначсобнікаў, якімі месячнае заданьне выкананa толькі на 19,9 проц.

Саўгасы таксама затрымліваюць здачу збожжа. За першую дэкаду верасьня месячнае заданьне саўгасамі выкананa толькі на 4,2 проц.

Шмат якія раёны, як і раней, ня выконваюць дырэктывы аб абавязковай прысылцы вестак. За апошнюю пяціднёўку няма вестак ад 52 раёнаў па лініі Белпаляводсаюзу і 9 раёнаў па лініі БКС.

Вельмі слаба разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва ў хлебазагатоўках. Камісіі садзейнічаньня ня здолелі мабілізаваць актыўнасьць бядняцка-серадняцкіх мас вакол хлебазагатоўчай кампаніі. Шырока разгорнутае сацыялістычнае спаборніцтва павінна стаць асноўным мэтадам ліквідацыі прарываў і выкананьня пляну. Верасень — рашаючы месяц хлебазагатовак.

У дзьве дэкады, якія яшчэ засталіся, трэба цавярстаць тое, што недавыкананa ў жніўні і ў першую дэкаду верасьня.

Верасьнёўскі плян хлебазагатовак павінен быць поўнасьцю выкананы.

46 РАЕНАЎ НЕ ПРЫСЫЛАЮЦЬ ВЕСТАК АБ ХОДЗЕ ЗАГАТОВАК

Ня гледзячы на пастановы ўраду і дырэктыўных органаў і ўказаньні Наркамгандлю аб прадстаўленьні вестак наконт ходу хлебазагатовак, 46 раёнаў дагэтуль ня прыслалі Наркамгандлю **ні аднэй зводкі.**

У выніку гэткіх нядбайных адносін да справаздачы аб ходзе хлебазагатовак, нельга судзіць аб разгортваньні кампаніі загатовак у гэтых раёнах і аб дэфэктах работы, нельга кіраваць хлебазагатоўкамі на мясцох.

Вось сьпіс раёнаў, якія не прысылаюць вестак:

Асьвейскі, Аршанскі, Астрашыцка-Гарадзецкі, Азарыцкі, Бабруйскі, Бешанковіцкі, Буда-Кашалеўскі, Бялыніцкі, Бягомльскі, Бярэзінскі, Ветрынскі, Вульскі, Вушацкі, Горацкі Гомельскі, Грэскі, Дрыбінскі, Дрысенскі, Жлобінскі, Кругляньскі, Крупскі, Клімавіцкі, Крычаўскі, Калінкавіцкі, Капыльскі, Лоеўскі, Лупалаўскі, Лельчыцкі, Мсьціслаўскі,-Магілеўскі, Прапойскі, Полацкі, Рэчыцкі, Расонскі, Сьвіслацкі, Самахвалавіцкі, Сьмілавіцкі, Талачынскі, Вузьдзенскі, Хоцімскі, Церахоўскі, Чачэрскі, Чавускі, Чэрвеньскі і Веткаўскі.

Ударны двухтыднёвік мабілізацыі тары

Праўленьне Белкаапсаюзу абвясьціла з 15 верасьня па 1 кастрычніка ўсебеларускі ўдарны двухтыднёвік збору і мабілізацыі тары.

Недахват тары тармозіць правядзеньне хлебазагатоўчай і плода-гародняй кампаніі. Патрэбны самыя безадкладныя і рашучыя меры для поўнай мабілізацыі тары, якая ёсьць у спажывецкай сыстэмы і ў насельніцтва.

Двухтыднёвік праводзіцца ва ўсіх зьвяньнях спажывецкай каапэрацыі. Арганізуюцца ўдарныя штабы па мабілізацыі тары з прадстаўнікоў грамадзкіх арганізацый, рабочых фабрык і заводаў, мясцовага друку, беднаты, батракоў, калгасьнікаў, каапэрацыйнага актыву і працаўнікоў прылаўку.

У пэрыяд двухтыднёвіка ўвага ўсёй грамадзкасьці павінна быць мабілізавана на пытаньнях скарыстаньня і максымальнай мабілізацыі рэсурсаў тары для кампаніі загатовак.

Усім зьвяньням спажывецкай каапэрацыі запрапанавана ўзяць на вучот усю тару, якая апаражнілася з-пад тавараў, праверыць наяўнасьць тары ва ўсіх гандлёвых пунктах сыстэмы, ажыцьцявіць безадкладны зварот тары ўсімі пастаўшчыкамі, стварыць спэцыяльную брыгаду хатніх гаспадынь для рамонту мяшкоў, арганізаваць камсамольскія, піянэрскія брыгады па зборы тары ў насельніцтва.

„Сустрэчны прамфінплян" адзіначсобнікаў

ПУХАВІЧЫ. (Наш кар.). Блоньскі сельсавет ідзе першым у Пухавіцкім раёне па хлебазагатоўках. Плян ужо выкананы больш чым на 80 проц. **Агульны сход беднякоў і серадняковў у парадку самаабавязацельства павялічыў больш чым на 10 тон контрольную лічбу, вызначаную Пухавіцкім РВК.**

7 верасьня ў мястэчка прыбыў чырвоны абоз з 700 фурманак адзіначсобных гаспадарак Блоньскага сельсавету. Здана звыш 50 тон збожжа. Першымі здалі збожжа сяляне пасёлку Зосіна.

Калгасы раёнаў здалі 28 тон.

Сельнор ДРОЗД.



На ссыпным пункце

Хлебазагатоўкі... „уключылі ў плян"

9 сельсаветаў Камарынщчыны ня здалі ніводнага кілё

Партыйныя і савецкія арганізацыі **Лоеўскага і Камарынскага раёнаў** не зварачаюць належнай увагі хлебазагатоўкам.

Сакратары Камарынскай і Елчанскай парт'ячэек заяўляюць, што ім дагэтуль **не ўдалося склікаць** партсходы па пытаньні аб хлебазагатоўках, а сакратары камсамольскіх ячэек запэўняюць, што яны **«уключылі хлебазагатоўкі ў свой плян для прапрацоўкі».**

Сакратар Убаркоўскай парт'ячэйкі, Лоеўскага раёну, адгаварваецца тым, што ён адзін у трох «лицах», таму ня мае часу займацца загатоўкамі. «Я ня сплю па начах, выконваю больш важныя заданьні»,—гаворыць сакратар.

Камісіі садзейнасьці загатоўкам бязьдзейнічаюць. Сельсаветы нічога ня робяць, чакаючы ўпаўнаважаных РВК.

У Елчанскі сельсавет, Камарынскага раёну, у Старадубскі, Баршчоўскі і Ўборкаўскі сельсаветы, Лоеўскага раёну — упаўнаважаныя РВК не зьяўляліся па два тыдні.

Да пятага верасьня па Камарынскім раёне не здалі ні аднаго кілё хлеба 9 сельсаветаў, па Лоеўскім — 4 сельсаветы.

З усёй сур'ёзнасьцю трэба падкрэсьліць, што **дагэтуль кулацкія гаспадаркі нічога не здалі.** Камарынскі і Лоеўскі райвыканкомы нават ня ведаюць ліку кулацкіх гаспадарак, ніхто не кантралюе, як здаюць хлеб кулакі.

Хлебазагатоўчыя арганізацыі Камарынскага раёну не падрыхтаваны да прыёму хлеба. У Райкалгассаюзе няма пляну ні здачы хлеба калгасамі, ні кантрактацыі.

Час пакончыць са стаўкай на самацёк — праяўленьнем правага апартунізму.

Упаўнаважаны Наркамгандлю і Цэнтрасаюзу СССР **ШПІГАР.**

Плян загатовак сена за жнівень праваленны

Загатоўкі грубых кармоў, як сена, саломы, капюшыны, у гэтым годзе набываюць асабліва важнае значэньне, у сувязі з мерапрыемствамі па пашырэньні жывёлагадоўлі. Здавалася-б, гэта павінны ўлічыць раённыя арганізацыі і сеназагатоўчыя органы.

Аднак, плян загатовак сена па сельгаскаапэрацыі за жнівень канчаткова праваленны. Інакш, як прагалам, нельга лічыць тое, што плян выканан на 2,6%. Ніякімі аб'ектыўнымі прычынамі нельга тлумачыць зрыў пляну. Іх няма— ёсьць толькі наўмысныя, бязадказныя адносіны да важнейшай работы. Як інакш можна кваліфікаваць адносіны мясцовых і загатоўчых арганізацый, калі з 100 раёнаў, якія займаюцца загатоўкамі, толькі 9 прыслалі весткі аб рабоце за жнівень.

Прыкладам нядбайнасьці можа служыць віцебскі райкаапсаюз, прадстаўнік якога ў прыватнай гутарцы заявіў, што загатоўлена 8 вагонаў сена, а вестак аб ходзе загатовак не прысылае.

На мясцох пляны сеназагатовак не даведзены да сельсаветаў і кулацкага двара. Няма ніякіх вестак аб тым, колькі сена павінна паступіць ад кулацкіх гаспадарак, якая колькасьць ужо паступіла.

Такія адносіны далей нецярпімы! Плян сеназагатовак павінен быць поўнасьцю выкананы!

ЛАЦІС.

З 21 ч. выехалі на раён 10 ч.

З супрацоўнікаў былога менскага акруговага фінаддзелу павінны былі паехаць на раён 21 чал. На сёнешні дзень выехала толькі 10 чал. 5 работнікаў застаюцца ў бюджэтнай групе і ўвесь час разьяжджаюць па розных раёнах. 4 работнікі зараз знаходзяцца ў Чырвонай арміі. 2 фінработнікі адмовіліся ехаць на раён, не пакінулі Менску і такім чынам сталі дэзэртырамі. Гэтых дэзэртыраў павінна ведаць наша грамадзкасьць. Вось іх прозьвішчы—**Барадзін С. і Вольскі.**

Прычыны нежаданьня ехаць на раён розныя: то дзеці вялікія і вучацца ў Менску, то дзеці малыя і няма дзе будзе іх вучыць.

Прафарганізацыі прымалі вельмі слабы ўдзел у разьмеркаваньні працаўнікоў па раёнах.

Былы валютны інспэктар Менакрфа тав. **Бірштэйн** добраахвотна згадзіўся паехаць на вёску і гэтымі днямі выяжджае на работу ў адзін з раёнаў Меншчыны.

Э.

Па якой цане загатаўляць гародніну?—

гэтага ня ведаюць загатоўшчыкі

З садавінай ня лепш, чым з гароднінай

Урокі Менску яшчэ не навучылі нашых загатоўшчыкаў

У Наркамгандлю БССР адбылася нарада, на якой абмяркоўваўся ліст тав. Рачыцкага аб пагрозе рэалізацыі ўраджаю гароднины і садавіны ў калгасах і саўгасах. Апрача гэтага, Наркамгандлю зноў быў прымушаны паставіць пытаньне аб забесьпячэньні гарадоў бульбай.

Нарада паказала, што, ня гледзячы на ўсе пастановы і дырэктывы партыі і ўраду, у загатоўках гароднины, фруктаў і бульбы існуе поўная блытаніна і адсутнасьць якога-б там ні было кіраўніцтва.

Высьвятляецца, што цэны, выпрацаваныя Наркамгандлю па загатоўках гароднины, зусім не адпавядаюць натрабаваньням сенешняга дня, і што іх трэба перагледзець. Вылучана камісія для высьвятленьня і ўстанаўленьня новых цэн. Гэта ў той час, калі загатоўкі па цэлым радзе прадуктаў ня толькі разгарнуліся, але ўжо заканчваюцца, калі ў калгасах і саўгасах пачала гніць гародніна.

Прадстаўнік Калгасцэнтру т. **Самусевіч** зусім правільна паставіў пытаньне аб неабходнасьці дапамагчы калгасам убрань ўраджай. Калгасы раду раёнаў шлюць трывожныя сыгналы аб тым, што гародніна гніе з-за недахвату рабочых рук для ўборкі ўраджаю. Калгасы ні ў якім разе ня могуць узяць на сябе падвоз гароднины з агародаў на загатоўчыя пункты. Калгасы заняты сяўбой, цягавая сіла занята на работах у полі.

Ёсьць рад выпадкаў, калі калгасы, якія знаходзяцца далёка ад загатоўчых пунктаў, прымушаны наймаць фурманкі і плаціць за дастаўку 3 кап. за кілёграм, у той час, калі за кілёграм капусты яны атрымліваюць 4 кап. Такім чынам, выходзіць, што калгас за сваю прадукцыю амаль нічога не атрымлівае.

Такое становішча неданушчальнае. Тав. Самусевіч прапануе наладзіць работу так, каб калгасы прадавалі ўбраную прадукцыю тут-жа ў калгасе і не падвозілі апошнюю да заготоўчага пункту. Каапэрацыя павінна наладзіць загатоўку гароднины ў самых калгасах.

Прапанова т. Самусевіча нарадай была прынята. Але тут узьнікла пытаньне, якія загатоўчыя цэны існуюць па капусту і інш. гароднину на месцы загатовак у калгасе ці саўгасе. У гэтых цэнах існуе такая блытаніна, правільней кажучы, **загатоўчых цэн на гароднину зусім няма,** што нарадзе прышлося вылучыць спэцыяльную камісію, якой прапанавана ў аднадзенны тэрмін склясьці загатоўчыя цэны на гароднину.

***

Яшчэ больш заблытанае становішча з садамі. Да гэтага часу большасьць садоў не замацавана за тэй ці іншай загатоўчай арганізацыяй. Паміж Белкаапсаюзам і Белсадсаюзам ідзе ведамасьцьвенная трызьня і канкурэнцыя.

Паводле пастановы ЭКАНА, Садсаюз павінен быў ахапіць загатоўкамі ўсе калгасныя і саўгасныя сады, а Белкаапсаюз—сады ў адзіначсобных гаспадарках. На самай-жа справе, Белкаапсаюз пайшоў па лініі найменшага супраціўленьня і заарэндаваў сады ў калгасах і саўгасах. Колькі садоў, у якіх раёнах ужо заарэндавана, ні Белкаапсаюз, ні Белсадсаюз ня ведаюць.

Прадстаўнік Белсадсаюзу на нарадзе выступіў з цэлай прамовай аб тым, што Белкаапсаюз перашкаджае сыстэме працаваць, захапляючы яе функцыі, між тым сам Белсадсаюз нічога не зрабіў для арганізацыі загатовак у саўгасах і калгасах. Сады ў адзіначсобных гаспадарках зусім не ахоплены загатоўкамі. Сотні пудоў ападу яблык гніюць, бо ніхто іх не загатаўляе; саўгасы і калгасы ўласнымі сіламі ня могуць арганізаваць загатовак, а загатоўчыя арганізацыі нічым ім у гэтай рабоце не дапамагаюць.

У той час, калі ёсьць цьвёрдая ўстаноўка, што фрукты павінны разьмяркоўвацца выключна па загадах Белплодагародніны, на мясцох яны злосна разбазарваюцца. У радзе раённаў спажывецкія таварыствы прадаюць яблыкі мяшкамі ўсім бяз усякага разбору. Некаторыя райкалгассаюзы (Хойнікі інш.) самі адкрылі спэцыяльныя крамы для продажу фруктаў. Гэта робіцца ў той час, калі Менск, Віцебск і інш. рабочыя цэнтры ня могуць забясьпечыць рабочае насельніцтва сваёвінай.

Райкалгассаюзы і саўгасы ўсю тару і цьвікі, якія былі ім даны для ўпакоўкі фруктаў, скарысталі на іншыя мэты, і зараз няма тары для ўпакоўкі садавіны.

Адным словам, з фруктамі справа стаіць ня лепш, чым з гароднінай.

***

Нядаўні прарыў у забесьпячэньні Менску бульбай, здавалася-б, павінен быў быць добрым вурокам для Белкаапсаюзу. У той час Наркамгандлю вынёс пастанову аб тым, што Белкаапсаюз абавязаны стварыць у Менску, Віцебску, Гомелі і Вабруйску сталы пяцідзённы запас.

Але, на жаль, сёньня зноў з усёй сур'ёзнасьцю прыходзіцца ставіць пытаньне аб забесьпячэньні гэтых гарадоў бульбай. 14 верасьня з Віцебску атрымана тэлеграма, што там застаўся толькі аднадзенны запас бульбы, а з Гомелю аб тым, што бульбы зусім няма.

Толькі з дні таму назад Менску зноў награжаў прарыў у забесьпячэньні бульбай. На бядзе было толькі 5 вагонаў бульбы.

Ва ўсіх гэтых прарывах вінаваты выключна чыноўнікі з Белкаапсаюзу, якія не праводзяць у жыцьцё важнейшых дырэктыў ураду. Апарат начыноўніцку, непаваротліва выконвае дырэктывы партыі і ўраду. Замест таго, каб паслаць людзей у раёны, узмацніць загатоўкі і адгрузку бульбы ў рабочыя цэнтры, Белкаапсаюз абмежаваўся пасылкай інструкцый і тэлеграм. Белплодагародніна з свайго боку да сёнешняга дня не займаецца рэгуляваньнем і наглядам за забесьпячэньнем гарадоў гароднінай.

Такія адносіны Белкаапсаюзу, Белплодагародніны да дырэктыў вышэйшых органаў нельга разглядаць інакш, як апартунізм па практыцы. Трэба бязьлітасна выганяць з дзяржаўнага і каапэрацыйнага апарату тых, хто ня здольны па-баявому наладзіць забесьпячэньне рабочых гароднінай і фруктамі.

Арк.

Пастанова УсеЦСПС

аб забесьпячэньні рабочых цэнтраў гароднінай

Прэзыдыум УсеЦСПС, у пастанове ад 8 верасьня, падкрэсьліў выключна важнае значэньне плода-гародняй кампаніі ў справе рабочага забесьпячэньня і павышэньня рэальнай зарплаты рабочых. Прэзыдыум адзначыў, што плода-гародныя арганізацыі не наладзілі кантролю за выкананьнем заданьня, не далі адпору мінімалісцкім плянам, апартуністычным тэмпам работы сваіх мясцовых арганізацый.

Ёсьць вялікія прарывы ў выкананьні пляну будаўніцтва хавальняў для гароднины і падрыхтоўкі тары.

Ня гледзячы на рад дырэктыў ураду аб першачарговасьці — забесьпячэньня асноўных прамысловых цэнтраў гароднінай, ва многіх загатоўчых раёнах наглядаецца выключнае месьніцтва (забарона вывазу, невыкананьне чарговасьці адгрузкі і г. д.), што ня можа быць інакш кваліфікавана, як праяўленьне яўна-правааапартуністычных дзеяньняў, якія б'юць на выкананьні прамфінпляну.

Зусім неўстарчальны ўдзел у прадвядзеньні плода-гародняй кампаніі прымаюць саветы прафэсыянальных саюзаў вытворчых раёнаў, (ЦЧО, Сярэдняя Волга, БССР). Не вядзецца барацьба з месьніцтвам, няма кантролю за выкананьнем нарадаў па вывазцы плода-гароднины.

Прэзыдыум УсеЦСПС вызначыў рад мерапрыемстваў для паляпшэньня забесьпячэньня рабочых цэнтраў плода-гароднінай. Усім прафарганізацыям, якія працуюць на вёсцы, запрапанавана наладзіць кантроль за своечасовым зьняцьцем плода-гароднины з агародаў і салоў і надачай грузаў да чыгуначных станцый.

Плода-гароднім арганізацыям запрапанавана разгарнуць кароткa-тэрміновыя курсы па падрыхтоўцы кадраў работнікаў.

Прафсыянальным арганізацыям вытворчых раёнаў даручана арганізаваць непаслабны кантроль за выкананьнем плянаў вываз плода-гароднины для прамысловых цэнтраў.

Нядбайнасьць і безадказнасьць у каапэрацыйнай рабоце

Суд над шкоднікамі рабочага забесьпячэньня, які нядаўна скончыўся, паказаў, што ў апараце МЦРК сядзяць работнікі, якія падрываюць справу забесьпячэньня рабочых цэнтраў. Гэты суд павінен быў паслужыць вурокам для ўсіх каапэрацыйных работнікаў. Але і дагэтуль ня зьнішчаны нядбайнасьць і безадказнасьць у каапэрацыйнай рабоце.

2 верасьня некалькі сялянскіх фурманак прывезьлі МЦРК з Чэрвеня яблыкі. Сяляне танялі з крамы ў краму, ніхто ня прымаў ад іх яблыкі. Нарэшце яны пасхалі на склад гароднины і там далі распараджэньне паслаць садавіну ў ларок № 23.

4 верасьня прыбілі дзьве фурманкі з зусім гнілой бульбай. Ларок № 23 катэгарычна адмовіўся прыняць дрэнную бульбу. Калі загадчык ларку спытаўся ў Райбюро МЦРК № 4,—што рабіць з гнілой гароднінай,—дык інструктар Маненіч катэгарычна запрапанаваў прыняць яе. Ён-жа сам потым, калі зайшоў у ларок № 23 і ўбачыў гнілую бульбу, пачаў скандаліць: «Чаму загадчык прымае дрэнную гародніну».

Групком і эканомкамісія МЦРК № 4 вылучылі ўдарныя брыгады для абсьледваньня крам з гароднінай. Брыгады выявілі, што ў крамах 104, 57, 148 прыказчыкі цэлы дзень нічога не рабілі, бо ня было гароднины. Брыгада зацікавіліся—магчыма ім база ня прысылала. Выявілася, што загадчыкі зусім не давал



Прызыўнікі ў ленкутку прызыўнага пункту.

НА 10.372 ТЫСЯЧЫ РУБЛЁЎ

рэалізавана пазыкі па БССР

Паводле даных НКФ, падпіска на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» на 10 верасьня па БССР дасягнула 10.372.000 руб., што складае 70,1 проц. кантрольнай лічбы.

Сярод рабочых і служачых рэалізавана 8.877.000 руб. — 80,7 проц. заданьня.

Сярод сялян рэалізавана 895.000 руб., што складае 35,8 проц. заданьня.

Падпіска сярод неарганізаванага насельніцтва складае 600 тыс. руб.— 46,1 проц.

Такім чынам, заданьне па сканчэньні рэалізацыі пазыкі сярод рабочых і служачых да 1 верасьня ня выканана яшчэ да 10-га.

Вельмі слаба ідзе рэалізацыя падпіскі на вёсцы, дрэнныя вынікі падпіснай кампаніі сярод неарганізаванага насельніцтва. Як мы бачым, пэўнага пералому ў падпіснай кампаніі яшчэ няма.

Выкарыстаць трамвайную лінію

для ліквідацыі затору на Менскім чыгуначным вузьле

Ніжэй зьмішчаем надзвычайна цікавую прапанову аб ліквідацыі затору на Менскім чыгуначным вузьле.

Рэдакцыя «Зьвязды» просіць усе адпаведныя органы і ўстановы выказацца па сутнасьці гэтае прапановы.

Адным з асноўных пытаньняў, якія займуць увагу Кастрычніцкай раённай партканфэрэнцыі — гэта **падрыхтоўка да асеньня - зімовых перавозак.** У залежнасьці ад бальшавіцкіх тэмпаў, якія будуць ужывацца пры асеньня-зімовых перавозках, залежаць і рэзультаты.

У маштабе г. Менску ёсьць **поўная магчымасьць з посьпехам правесьці работу па перавозцы грузаў і вызваленьня чыгуначнага вузла ад заторaў пры двух умовах:** 1) поўнага і ўсебаковага выкарыстаньня трамвайнай лініі для перавозкі грузаў, 2) рацыянальнага выкарыстаньня наяўных аўтамашын і ўжавога транспарту.

Трэба адзначыць, што на сёньняшні дзень на тэрыторыі чыгуначнага вузла **ёсьць да 500 вагонаў ня вывезеных грузаў.** Пры патоку хлебных грузаў і бульбы затор стане яшчэ большым.

Што практычнага трэба зрабіць?

Першым неадкладным мерапрыемствам у бліжэйшыя дні павінна зьявіцца адлучэньне чыгуначнай лініі з трамвайнай у Менск - таварная. Адлучэньне для адлучэньня зусім маленькая, выдаткі таксама будуць самыя нязначныя.

Потым павінны быць пракладзены веткі з рэек вузкакалейнага тыпу у месцы выгрузкі. У першы час такімі месцамі павінны зьявіцца: пабудовы Дому Друку, Дому Ураду, Акадэміі Навук, завод «Беларусь», «Камунарка».

У далейшым колькасьць аб'ектаў павінна быць пашырана.

Перавозка грузаў праводзіцца ўначы, у выключных выпадках удзень. Трамвайны вагон уначы можа быць прадастаўлен для гэтай мэты. У выпадку немагчымасьці прадастаўленьня трамвая —рэйкавыя шляхі могуць быць на працягу ўсяе ночы выкарыстаны шляхам цягі конямі. Для перавозкі грузаў выкарыстоўваюцца малыя пляцоўкі на невялікіх скатах, ёмістасьцю 3,5—4 тоны. Пара коняй могуць шпарка павезьці 4 пляцоўкі. Між тым 16—17 тон звычайна перавозяцца 10 конямі. Малая наяўнасьць гужтранспарту яшчэ больш падкрэсьлівае гэту неабходнасьць.

Другой умовай для ўнікненьня затору на чыгуначным вузьле — гэта **рацыянальнае выкарыстаньне наяўнага аўтагужавога парку.** На сёньняшні дзень ён надзвычайна распылен. Аўтагужпарк ёсьць у «Саюзтрансе». Ёсьць аўтагужпарк таксама і пад ведамам УМТ'у.

«Саюзтранс», як арганізацыя НКШЗ, у сілу ўскладзеных на яго задач павінен мець для абслугоўваньня кліэнтуры аўтагужтранспарт. Наяўнасьць двух паралельных аўтагужтранспартаў пазбаўляе магчымасьці каардынаваць дзейнасьць і рацыянальнае выкарыстаньне наяўных аўтамашын.

Наяўнасьць двух аўтатранспартных гаспадарак, якія дзейнічаюць кожная паасобку, ня толькі не даюць магчымасьці на 100 проц. выкарыстаць наяўнасьць транспартных адзінак, але галоўным чынам перашкаджае зьніжэньню сабекошту перавозак.

Трэба стварыць колькасьць аб'ектаў павінна быць пашырана.

Перавозка грузаў праводзіцца ўначы, у выключных выпадках удзень. Трамвайны вагон уначы можа быць прадастаўлен для гэтай мэты. У выпадку адзін аўтагужпарк пры Саюзтрансе, дзе пры наяўнасьці цэнтралізаванага кіраўніцтва і забесьпячэньня — аўтамабільная гаспадарка будзе лепш выкарыстана.

Я. КЭЙЛІН.

МЕНСК

Пачынаецца праверка заборных кніжак

ЦСПСБ, разам з Белкаапсаюзам распрацавалі парадак праверкі правільнасьці выдачы і карыстаньня заборнымі кніжкамі.

Праверка мае мэтаю выявіць і ньвішчыць усе выпадкі няправільнай выдачы заборных кніжак і лісткоў, а таксама злоўжываньняў імі.

Агульнае кіраўніцтва праверкай усклаецца на спэцыяльна вылучаную цэнтральную брыгаду ў складзе старэйшага брыгадзіра ад ЦРК, прадстаўнікоў саюзу саўгандальслужачых, рабочых прадпрыемстваў, каапактыву і хатніх гаспадынь-актывістак.

Да пачатку праверкі будзе праведзена некалькі інструкцыйных нарад. Праверка праводзіцца паводле раённага прынцыпу, па месцы жыхарства спажыўцоў. Гарады будуць разьбіты на поўную колькасьць раёнаў, вучасткаў і кварталаў, пры якіх будуць працаваць праверачныя пункты.

Кожны праверачны пункт будзе забясьпечаны добра праінструктаванай тэхнічнай сілай, якая будзе працаваць сумесна з раённай брыгадай. Праўленьні ЖАКТаў і домакіраўніцтвы, разам з брыгадамі, устанаўляюць колькасьць жыхараў і складаюць асобныя сьпісы на тых, якія ня маюць права атрымліваць заборныя кніжкі.

Па ўсіх домах будуць вывешаны каляндарныя планы праверкі. Адначасова з праверкай будзе абсьледавана разьмеркаваньне дадатковага харчаваньня праз лекавыя ўстановы (водпуск прадуктаў на спраўках амбуляторый, дыспансэраў і больніц). Будзе высьветлена правільнасьць выдачы наборных кніжак, наколькі сыстэма водпуску дэфіцытных тавараў у магазынах МЦРК гарантуе ад злоўжываньняў, наколькі выразна і своечасова паведамляюць спажыўца аб выдачы дэфіцытных тавараў.

Пасьля сканчэньня праверкі брыгады зробяць справаздачу на рабочых сходах па прадпрыемствах і на сходах пайшчыкаў.

Праверка пачынаецца з сёньняшняга дня.

Ц.

Прыезд украінскіх пісьменьнікаў

У Менск прыехалі украінскія пісьменьнікі ГЖЫЦКІ і БЫКАВЕЦ.

Пісьменьнікі камандыраваны Наркамасьветы УССР і украінскай фэдэрацыяй пралетарскіх пісьменьнікаў у адказ на запрашэньне НКА БССР.

Украінскія госьці азнаёмяцца з першай усебеларускай с.-г. выстаўкай, з культурнымі ўстановамі гораду, пабываюць на радзе фабрык і заводаў.

Па звароце на Украіну яны зьмесьцяць ва украінскіх часопісях нарысы, прысьвечаныя дасягненьням БССР у галіне сельскай гаспадаркі і прамысловасьці.

Прыезд украінскіх пісьменьнікаў дапаможа завязаць больш цесную сувязь паміж украінскай і беларускай пралетарскай літаратурай.

ЗАТРЫМАНЫ СПЭКУЛЯНТЫ ЗАБОРНЫМІ КНІЖКАМІ

Учора Крымвышук затрымаў рабочага заводу «Энэргія»—**Германа** (б. члена каапэрацыйнай камісіі), які 2 верасьня атрымаў па спэцыяльным мандаце з ЦРК 530 талёнаў на атрыманьне дэфіцытных тавараў і зьнік з імі. Таксама затрыманы скупшчык талёнаў **Дзямідовіч,** у якога, акрамя талёнаў, знойдена 5 каапэрацыйных кніжак. Абодвым прад'яўляюцца абвінавачаньні па 69 арт. КК.

Чырвоны абоз—на вуліцах Менску

Учора ў Менск прыбыў чырвоны абоз калгасьнікаў і індывідуальнікаў Сеньненскага раёну, які на 46 фурманках даставіў 25 тон хлеба. Хлеб перададзены каапэрацыі.

Усім філіям БелАПП'у

Улічваючы надзвычайную важнасьць мабілізацыі ўсіх сіл на ліквідацыю прарываў у прамфінпляне, сакратарыят БелАПП'у прапануе безадкладна прапрацаваць адозву ЦК УсеКП(б). Усім філіям прапануецца зараз жа зьвязаць з прадпрыемствамі, фабрыкамі, заводамі і калгасамі.

Пісьменьнікі павінны дапамагчы фабрычна-заводзкім арганізацыям мабілізаваць увагу рабочых мас на выкананьне прамфінпляну, арганізаваць і палепшыць работу гурткоў рабкораў, дапамагчы пачынаючым пісьменьнікам—рабочым і калгасьнікам.

Бюро філіі павінны ў 4-хдзённы тэрмін паведаміць, якія меры прыняты для ажыцьцяўленьня адозвы ЦК УсеКП(б).

Сакратарыят БелАПП'у.

ЗА ДЗЕНЬ

— У гэтым годзе ўпяршыню ленінградзкая кіно-фабрыка Белдзяржкіно прыступае да выпуску гукавога кароткаметражнага фільму «Навальніца», які малюе сацыялістычнае будаўніцтва ў БССР.

— Прэзыдыум Дзяржпляну пастанавіў пабудаваць у наступным годзе больніцу і амбуляторыю ў г. Дуброўне. На пабудову адпушчана 275.000 руб.

— Апрача двух закрытых разьмеркавальнікаў у раёне Ліхаўкі і МБВ чыг., МЦРК адкрывае яшчэ адзін закрыты разьмеркавальнік у пасёлку «Камінтэрн».

— У 1930-31 годзе завод «Чырвоны Хэмік» (Нова-Беліца) пачынае вырабляць магнэзыяльна-азбэставую тэрмаізаляцыю (ізаляцыю электраправадоў). Гэта вытворчасьць зьяўляецца зусім новай у СССР.

Разгрузіць Эльвод

Спачатку гэтага году прэзыдыум Гарсавету пастанавіў перадаць гарадзкую каналізацыю для эксплёатацыі Эльводу. Эльвод зараз абʼяднае 4 віды камунальнай гаспадаркі: электрастанцыю, водаправод, каналізацыю, а таксама пабудову цэпла-электра-цэнтралі.

Зразумела, ён ня можа зьвярнуць належнай увагі на ўсе гэтыя галіны работы. У прыватнасьці, вельмі павольна ідзе далучэньне дамоў да каналізацыйнай сеткі. Трэба стварыць спэцыяльную арганізацыю, якая-б кіравала каналізацыйнай справай у Менску.

ХОШЫЦЭР.

400 рабочых пазбавілі абедаў

На чыгуначным вузьле ст. Менск пры заводзе «Полымя Рэвалюцыі» ёсьць сталовая з прапускной здольнасьцю на 800 чал. у дзень. Увесь час у гэтай сталовай атрымлівалі абеды як рабочыя заводу, так і рабочыя чыгункі, дэпо і г. д. Нідаўна, невядома па якіх прычынах, па загаду «трыкутніка» заводу, рантам забілі дзьверы сталовай і 400 рабочых не атрымалі абедаў. 400 абедаў прышлося выкінуць. Мы патрабуем прыцягненьня да адказнасьці вінаватых у гэтым галавацяпстве.

Арцішэўскі, Цецерын, Бернатовіч, Урбановіч.

Зімовы сэзон тэатраў БССР

У гутарцы з нашым супрацоўнікам, старшыня Галоўмастацтва БССР тав. **Гурскі** паведаміў наступнае:

— **Першы Беларускі Дзяржаўны Тэатр** 20-га верасьня **«Гутаю» Рыгора Кобеца** адкрывае сэзон у Віцебску. Апрача «Гуты» са старых рэчаў пойдуць **«Міжбур'е»** і **«Ярасьць».** Перарабляецца таксама **«Каваль-Ваявода».**

Для БДТ-1 піша зараз новую п'есу яго рэжысэр заслужаны артысты **А. Міровіч.**

БДТ-2, які працуе зараз у Менску, ідзе ў адначынак. 25-га кастрычніка ён распачынае ў Менску зімовы сэзон пастаноўкаю п'есы **В. Кіршона «Горад вятроў».** З рэчаў былых сэзонаў у рэпэртуар БДТ-2 уключаны **«Простыя сэрцы», «Рэйкі гудуць», «Калі сьпяваюць пеўні», «Разлом», «Авангард»,** і, у пераапрацаваным выглядзе, **«Каля тэрасы».**

Беларускі Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр будзе працаваць з восені ў Гомелі. Магчыма, што ён узімку паедзе на гастролі за мяжу.

Дырэкцыям усіх дзяржаўных тэатраў запрапанавана ў тыднёвы тэрмін прадставіць у Галоўмастацтва свае рэпэртуарна-вытворчыя пляны.

У кастрычніку Галоўмастацтва склікае шырокую нараду па пытаньні мастацкага абслугоўваньня шырокіх працоўных мас і масавае работы мастацкіх прадпрыемстваў. На нараде будуць дырэктары і мастацкія кіраўнікі тэатраў, загадчыкі клюбаў, старшыні культадзелаў ЦП прафсаюзаў, прадстаўнікі культпропу ЦК КП(б)Б, культсэктару ЦСПСБ і рэдакцый цэнтральных газэт.

ВАКХАНАЛІЯ НА ЗАГАТОЎКАХ УЦІЛЮ

Пляны загатовак зрываюцца

У чацьвертым квартале бягучага году наглядаецца рэзкае зьніжэньне загатовак уцільсурцу. Асабліва зьменшыліся загатоўкі па Полацкім і Аршанскім раёнах, дзе Белдзяржгандаль, спажывецкая каапэрацыя і Сампрамсаюз ня справіліся са сваімі плянамі.

Уся бяда ў тым, што нашы загатоўшчыкі дагэтуль не перабудавалі сваёй работы, яны чакаюць наступленьня ўцілю ад карабейнікаў, якія выдаткуюць вялікую колькасьць прамтавараў бяз усякага кантролю, бяз усякай справаздачы.

Спажывецкая каапэрацыя, якая ня мае апарату карабейнікаў, захапляецца раздачай прамтавараў і разбазарвае таварныя фонды. Наогул наглядаецца, што загатоўшчыкі канкуруюць у найбольшым прэміраваньні здатчыкаў уцілю. Загадчык Полацкага агэнцтва Белдзяржгандалю проста заявіў: «будзе загатоўлена столькі, колькі будзе прамтавараў». Замест 100 тон ён загатовіў у ліпені 15.

Ніякая грамадзкай работы вакол загатовак уцілю не вядзецца. Камсамол, які летась правёў вялікую работу па загатоўках, у гэтым годзе нічога ня робіць і ня прыцягнуты да загатовак.

Сампрамкаапэрацыя займаецца тым, што пераманьвае ўсіх зборшчыкаў і карабейнікаў, абяцаючы ім залатыя горы. Яна сапраўды забясьпечвае зборшчыкаў дэфіцытнымі таварамі і гэтым дэзарганізуе рынак.

Няма сумненьня ў тым, што асноўнай прычынай зрыву загатовак зьяўляецца бясплянавая, безадказная сыстэма раздачы прамтавараў.

У выніку вакханаліі, адсутнасьці грамадзкай работы, адсутнасьці кантролю Белдзяржгандалю і спажывецкая каапэрацыя выканалі за 10 месяцаў плян збору ўцілю на 50-55 проц.

Л. МАНІН.

З ЛІСТОЎ РАБСЕЛЬКОРАЎ

Вывазка лесу зрываецца

Лесазрываўкі па Бягомльскім раёне зрываюцца. **Мсьціскі і Зэмбінскі** вучасткі Лесбелу да гэтага часу амаль нічога не зрабілі, каб палепшыць вывазку дроў.

Ударныя тройкі, якія павінны быць пры кожным сельсавеце, ня створаны.

Сельсаветы ў гэтых адносінах таксама бязьдзейнічаюць. Напрыклад: **Мсьціскі** сельсавет свайго плянавага заданьня ня выканаў. Замест вывазкі прадугледжаных паводле пляну **15.000 куб. мэтр.,** на сёньнішні дзень вывезена толькі **375 куб. мэтр.** Прычыны гэтага зусім простыя,—насельніцтва не мабілізавана вакол баявых задач па вывазцы лесу.

ПЭКО.

Сяўба пачалася

Вельмі цяжка павышаць ураджайнасьць нашых палёў пры безадказнасьці і расхлябанасьці мясцовых арганізацый.

У **Прыбарскім** сельсавеце, **Рагачоўскага раёну,** 3/IX пачалася сяўба.

Сяляне з-за нядбайных адносін сельсавету сеюць неачышчанае насеньне.

Камітэт сялянскай **узаемадапамогі** бязьдзейнічае. Трыёры, сявяркі, сталі да самага пачатку сяўбы пад замком. Праўленьню калгасу трэба паклапаціцца аб зьнішчэньні гэтых недахопаў.

БІТУС.

Хто нясе адказнасьць

У Горадзкім спажывецкім таварыстве ў сучасны момант знаходзяцца 90 шт. сьвіней. Гэтыя сьвіньні з-за няспраўнасьці страхі ў часе дажджу купаюцца ў грязі. Апрача гэтага сьвіней кормяць бяз нормы, няма ніякага догляду за імі.

У выніку ўсяго гэтага, у канцы зімы 1930 году, у сьвінарніку здохла **10 старых сьвіней,** у маі і чэрвені месяцы г. г. здохла **звыш 40 сьвіней.**

Увесну 1930 году спаж. таварыствам быў складзены праект новага сьвінарніка **на 150 племяных матак.** З самай вясны будуецца гэты хлеў, але і да гэтага часу не пабудаван. Ёсьць пагроза, што да зімы хлеў ня будзе гатовы і спаж. таварыства ня зможа ня толькі паставіць 150 матак, але ня будзе хлева і для тых сьвіней, якія ўжо ёсьць.

Адпаведным органам трэба тэрмінова прыняць меры.

Н. ЛІТОК.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— 17-га верасьня ў памяшканьні Фрунзаўскага РК КП(б)Б а 6 гадз увеч. склікаецца пасяджэньне бюро РК з удзелам усіх сакратароў партыйна-савецкіх ячэек, партыйнаў старшынь мясцкомаў, кіраўнікоў устаноў і эканомсэктараў з парадкам дня: 1. Праверка правядзеньня ў жыцьцё адозвы ЦК УсеКП(б) па савецкіх установах (інфармацыі трохкутнікаў ВСНГБ і Наркамацыі трыкутнікаў ВСНГБ і Наркамзему і судаклад камісіі па абсьледваньні. Яўка членаў і кандыдатаў бюро і ўсіх вышэйпералічаных асоб абавязкова.

— **БДУ.** Сёньня а 5 гадз. увеч. у габінэце прарэктара адбудзецца пасяджэньне асьпіранцкага бюро БДУ. Запрашаюцца асьпіранты БДУ і мэдінстытуту.

— **Да сведама навуковых працаўнікоў.** ЦБ сэкцыі навуковых працаўнікоў прапануе членам сэкцыі, утрыманцы якіх ня былі прыняты ў ВНУ БССР, зарэгістравацца ў сэкцыі да 20 верасьня з 2 да 4 гадз. дня ў т. Юдовіча.

Час. вып. абав. адказ. рэдактара
А. МІТЛІН.

КАСТРЫЧНІЦКІ РК КП(б)Б

18 верасьня, а 6 гадз. увеч. у памяшк. клюбу моталістых (Унівэрсытэцкая, 12),

склікае

ПА-ЗАЧАРГОВУЮ РАЙПАРТКАНФЭРЭНЦЫЮ

з парадкам дня:

1. Вынікі выкананьня прамфінпляну за 29-30 г. і задачы выкананьня прамфінпляну ў 30-31 г. (сустрэчны прамфінплян і г. д.). 2. Аб падрыхтоўцы транспарту да асеньня-зімовых перавозак. 3. Выбары РКК.

Сьпісы дэлегатаў павінны быць прадстаўлены ў РК не пазьней 17 верасьня. Мандаты атрымаць у РК з 9 да 3 гадз. дня.

КАСТРЫЧНІЦКІ РК КП(б)Б

склікае 17 верасьня, а 6 гадз. увеч. у памяшк. РК (пакой культпропу)

ПА-ЗАЧАРГОВЫ ПЛЕНУМ РК

У ПАРАДКУ ДНЯ:

1. Пытаньні канфэрэнцыі. 2. Вынікі абсьледваньня партакалектыву МЦРК. 3. Розное.

Просьба да членаў і кандыдатаў РК, рэўкамісіі і парттройкі і сакратароў ячэек КП(б)Б зьявіцца без спазьненьня.

ФРУНЗАЎСКІ РК КП(б)Б

СКЛІКАЕ

16 верасьня а 6 гадз. увеч. у памяшк. РК.

Нараду партыйцаў, якія працуюць па грамадзкім харчаваньні.

У парадку дня: 1. Практычнае ажыцьцяўленьне адозвы ЦК УсеКП(б) па работы забесьпячаньні (даклады з месц).

Яўка абавязкова: усіх камуністых Фрунзаўскага раёну, якія працуюць на грамадзкім харчаваньні (сталовак, буфэтаў, крам і т. п.), фракцый фабрычна-заводзкіх каапэрацыйных камісій, фракцый МЦРК, ЦП нархарч і бюро ячэйкі хлебазаводу.

Фрунзаўскі РК КП(б)Б

БАРЫСАЎСКІ РАЙКОМ КП(б)Б

у выдзелю 21 верасьня а 12 гадз. дня ў памяшк. райкому КП(б)Б склікае

пашыраную нараду селькораў, юнкораў і насьценкораў Барысаўскага раёну

У парадку дня: 1. Аб загатоўках, 2. Аб разьмеркаваньні ўраджаю, 3. Розное.

Мастацкі ЦЫРК | Пад кіраўніцтвам І. Л. СТРАШЭВІЧА

Аўторак, 18, Серэда, 17, і Чацьвер, 18 верасьня.

ВЯЛІКІЯ ПРАДСТАЎЛЕНЬНІ

ПЕРШАЯ ГАСТРОЛЬ

рэкордных турыстак на 5-ці турніках

БОЛЬТЭНСЫ

АПОШНІЯ ДНІ ГАСТРОЛЯЙ. Выкрышыць сыстэмы чалавек-рахункова машына **Аляксандра Хэйфеца,** музычных сатырыкаў **Біб-Боб**

Увесь ногы рэпэртуар.

Працяг гастроляй

Чалавек-фантан! Чалавек-агнягасіцель! **Гётамо**

Артыстыя балету **Мойсеева і Поль** | Японскі артысты **Осадо** | Акрабатычныя танцы—эквілібрысты.

— Пачатак а 8 г. 30 м. —

Адказны кіраўнік І. Л. СТРАШЭВІЧ.

АНОНС!

СЬВЯТА СЬВЯТОГА ЁРГЕНА

У гал. ролях;

Ігар Ільлінскі, Страпкова, Ктораў.

Кіно-тэатр **„Культура“** — Мастацкі фільм **Цьвёрды характар** сучасная драма ў 6 частках. Звыш праграмы: **ВАЙНА СТРАТАМ** культурфільм у 1 частцы. **1-шы ўсебелар. аўта-вэлё-прабег,** кіно-нарыс вытворчасьці Белдзяржкіно. Пачатак сэансаў: а 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м. Каса адкрыта ад 5 гадз.

КІНО „Інтэрнацыянал“ — Нямецкі фільм **НЯВЕСТА БОКСЭРА** Штодзённа 4 сэансы. Пачатак: а 6 г., 7 г. 20 м., 9 г., 10 г. 30 м. Каса—з 5 гадз. увеч.

КІНО „Пралетары“ — Нямецкі фільм **ДЗЕЛЯ ДЗІЦЯЦІ** (КРЫВАПРЫСЯГА) Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса—з 5 гадз.

Дзіцячы кіно-тэатр **„ЮНЫ ПІЯНЭР“** — 2 новыя фільмы 2 **1) ЗАУТРА НОЧЧУ** (пабег 10 сьмертнікаў з варшаўскай турмы) **2) ЖАРТЫ МАРОЗА** камэдыя ў 1 частцы. КОЖНЫ ДЗЕНЬ 2 СЭАНСЫ. Пачатак 1-га сэансу а 2 г. дня. Каса адкрыта ад 12 гадз.

Кіно **„СПАРТАК“** — Выдатны мастацкі фільм **ЗАРЭ** драма ў 7 частках. У ГАЛ. РОЛІ **МАРЫЯ ГЭНАЗІ.** Пачатак сэансаў: 1—7 г., 2—9 г., 3—10 г. 30 м. Каса—ад 6 гадз.

Камуністычны унівэрсытэт Беларусі імя Ў. І. Леніна

З 25-га верасьня па 25-га кастрычніка 1930 г. адкрывае

ПРЫЁМ НА ЗАВОЧНА-курсавы сэктар

па наступных аддзяленьнях:

1. **Партыйнага будаўніцтва,** з 3-гадовым курсам навучаньня, для падрыхтоўкі кіруючых працаўнікоў райкомаў, гаркомаў і буйных парткалектываў.
2. **Прапагандысцкае** (з 2 цыклямі: гістарычным і эканамічным), з 4-гадовым курсам навучаньня, для падрыхтоўкі прапагандыстых-выкладчыкаў грамадазнаўчых прадметаў.
3. **Дакамвузаўскай падрыхтоўкі,** на працягу аднаго году плянам завочнага і курсавога навучаньня рыхтуе да паступленьня на 1-ы курс асноўных аддзяленьняў дзённага КУБ'у.

Ва ўсіх гэтых аддзяленьнях завочнае навучаньне чаргуецца з курсавым (на 2 м-цы завочнікі штогодна зьбіраюцца на курсы пры ук-це).

Скончыўшыя аддзяленьні партбудаўніцтва і прапагандысцкае ЗКС КУБ'у прыраўніваюцца да скончыўшых асноўныя аддзяленьні камвузу.

ЗКС таксама праводзіцца навучаньне па асобных прадметах па камвуваўскіх праграмах: 1. Палітэканомія. 2. Гісторыі УсеКП(б) і КП(б)Б. 3. Агульнай гісторыі клясавай барацьбы. 4. Эканомгеаграфіі. 5. Дыялект. матар.

Усе жадаючыя вывучаць які-небудзь з паказаных прадметаў падаюць аб гэтым заяву ў завочна-курсавы сэктар Кам. Ун-ту Беларусі.

З 1-га ЛІСТАПАДА ПАЧЫНАЮЦЬ ПРАЦАВАЦЬ

3-месячныя курсы па перападрыхтоўцы раённага партыйнага актыву.

Набор на курсы робіцца па камандыроўках райкомаў.

Падрабязныя весткі аб умовах прыёму, аб праграмах і навучальным плянe зьмешчаны ў спэцыяльным праспэкце завочна-курсавога сэктару Кам. Ун-ту Беларусі, які маецца ў кожным РК КП(б)Б.

ПРАЎЛЕНЬНЕ КУБ'у.

ТЫРАЖ 2-га разраду 2-й аўта-лётарэі **АЎТАДОРУ**

АДБУДЗЕЦЦА

25 і 26 верасьня 1930 г. у г. Харкаве.

РАЗЫГРЫВАЮЦЦА: 1 глісэр, 10 аўтамабіляў „Форд“, 10 матацыклаў, 300 взлёсьпіздаў і яшчэ каля 1.650 выйгрышаў.

Кошт білету 50 кап.

СЬПЯШЭЦЕ КУПІЦЬ БІЛЕТЫ 2-Й АЎТА-ЛЁТАРЭІ, КАБ ПРЫНЯЦЬ УДЗЕЛ У ТЫРАЖЫ.

Продаж білетаў у аддзяленьнях і ячэйках аўтадору і касах Дзяржбанку. Білеты таксама высылаюцца цэнтральным праўленьнем Аўтадору БССР (Менск, Савецкая, 82) па атрыманьні кошту іх і 20 кап. на перасылку.

МЯНЯЮ КВАТЭРУ

ў **Рэчыцы** з 2-х пакояў і кухні ў самым цэнтры на 1 пакой у **Менску.** Зьвярнуцца: Савецкая, 57, пакой 31, МАЛЯКІНУ, ад 4 да 7 гадз. веч.

13-IX г. г.

ЗГУБЛЕН ШТАМП

6. акруговага камітэту т-ва ЧЫРВОНАГА КРЫЖУ.

лічыць несапраўдным.

МАГІЛЕЎСКІ БУДАЎНІЧЫ ТЭХНІКУМ

абвяшчае, што пры тэхнікуме будзе існаваць

архітэктурнае аддзяленьне

з наступнымі спэцыяльнасьцямі:

а) **Фабрычна-заводзкае будаўніцтва,**
б) **Сельска-гаспадарчае будаўніцтва,**
в) **Санітарна-тэхнічнае будаўніцтва,**
г) **Жыльлёвае будаўніцтва.**

Прыём заяў у тэхнікум праводзіцца **ДА 20-га ВЕРАСЬНЯ Г. Г**

Інтэрнатам і стыпэндыяй будуць забясьпечаны 65-70 проц. студэнтаў. Заявы накіроўваць па адрасе: Магілеў БССР, Першамайскі праспэкт д. № 54 (1-я сямігадовая школа імя Энгельса), Магілеўскаму будаўнічаму тэхнікуму.

Дырэктар Маг. буд. тэхнікуму **ЛІПСКІ.**

3-IX-30 у саўгасе «Лагаза», Лагойскага р-ну,

УКРАДЗЕНЫ САБАКА

кобель, гончы, чорнай масьці, шэрсьць кароткая, бліскучая, ногі з спродзіны чырвоныя, звадворку на пальцах чорныя палоскі, над вачыма чырвоныя круглыя кропкі, доўгі стан, хвост загнуты трохі ўверх, тонкі, клічка «Цэзар». Знайшоўшага просьба паведаміць за асобную плату па адрасе: Лагойск, саўгас «Лагаза», **Бортніку М. А.**

УСІМ стыльрэдам, карэктарам, перакладчыкам і мастакам, якія працуюць для БДВ,)—) належыць (—(

ПЕРАРЭГІСТРАВАЦЦА

да 23 верасьня ў БДВ пакой № 14.

Асобам, якія да азначанага часу не перарэгіструюцца, **работа даваццa ня будзе**

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕ ЦТВА.

Рэдакцыя газэты „АКЦЯБР“

ПЕРАМЯСЬЦІЛАСЯ ў новае памяшканьне на Рэвалюцыйную вул. № 2 (у б. памяшканьне Менскай Акрпракуратуры).

На ўсіх справах рэдакцыі і канторы зварачацца па вышэйпаказаным адрасе.

Вышаў з друку, разасланы ўсім падпісчыкам і паступіў у раздробны продаж

№ 24 (жнівень),

часопісі

„Беларуская работніца і сялянка“

з дадаткам: выкройка гарнітура для хлопчыка 5 г.

Выходзіць тры разы ў месяц.

Зьмест нумару

1. **Завелевіч**—«Вычаваем заданьне па пазыцыі»
2. **А. Б.**—«УсеКП(б) і нацыянальнае пытаньне».
3. **Русановіч**—«За сустрэчны прамфінплян».
4. **Хацкевіч**—«Работніцы ф-кі «БЕЛАРУСКА» арганізуюць сустрэчны прамфінплян.»
5. Пастанова ЦК КП(б)Б аз 22-VIII-30 г. аб перавыбарах дэлегацкіх сходаў.
6. **Язэп Вазёрны**—«Нашыя дні.» (ліра-паэма)
7. **Беразоўскі**—«Маці»—(аповесьць).
8. **А. Кац**—«V Кангрэс Камінтэрну».
9. **Платун**—«За пасьпяховае правядзеньне ўсесаюзнага навучаньня».
10. **Матар'ялы з месц:**

а) **Селькорка**—Больш увагі жаночай працы
б) **Л. Путырская**—«Як брыгада чыгуначніц працавала паўдарнаму.»
в) **Г. Плоткін**—«Мопраўцы дапамагаюць уборачнай кампаніі у калгасах».
г) **Дэлегатка**—«З дапамогай рабочай клясы замацуем калгас».

9) **Яхновіч.** 10—трэба клясава перавыхаваць новых работніц
11. **Фота-мантаж выстаўкі.**
12. **Д-р М. Полян**—«Вэнэрычныя хваробы ў жанчын.
13. **Торбе**—«Аб цяжка выхоўваемых дзецях».
14 Што зроблена па допісах рабселькораў.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

На адзін месяц—20 кап. Паўгода . . 1 р. 20 к.
Тры месяцы—60 „ Год . . . 2 „ 40 „

Падпіску можна здаваць на пошту, лістаносцам, у кіёскі ці прысылаць у выдавецтва «Зьвязда», Савецкая, 63.

ДА ЎВАГІ КААПЭРАЦЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

АБСТАЛЯВАНЬНЕ ДЛЯ закрытых разьмеркавальнікаў

АДПУСКАЕ

БЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА **„АРГБУД“**

Утвараецца таксама арганізацыя і абсталяваньне закрытых разьмеркавальнікаў сіламі «Аргбуду».

Заяўкі і заказы накіроўваць: Менск, Савецкая, 55, «Беларгбуд»

Галоўдартрансам адкрываюцца курсы „Дорстройуча“

з кваліфікацыяй цесьляроў і аўтаманцёраў.

У школупры маюцца вучні абодвага роду—дзеці рабочых, батракоў, калгасьнікаў, беднякоў, сераднякоў, служачых і саматужнікаў, якія знаходзяцца ў арцелях, з адукацыяй 5—7 клясаў 7-годкі для аўтаманцёраў і 4 клясы для цесьляроў, ва ўзросьце ад 15 да 19 год.

Прыём заяў працягнецца **да 25 верасьня** ў г. Бабруйску, Пушкінская № 52, дом 6. акрдараддзелу.

Школа аўтаманцёраў адкрываецца ў Бабруйску, а школа цесьляроў у г. Рагачове.

Тэрмін навучаньня для цесьляроў 1 з пал. г., аўтаманцёраў—2 гады. Да заявы прыкладаюцца дакумэнты: аб сацыяльным становішчы, адукацыі, аб узросьце, фізычным стане і аб праве голасу. Скончыўшыя гэтыя курсы скарыстоўваюцца на працах Галоўдартрансу і могуць быць накіраваны ў вышэйшыя навучальныя установы па гэтай кваліфікацыі. Курсанты атрымоўваюць стыпэндыю і інтэрнат.

Адміністрацыя.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ ЎЗАЕМАДАПАМОГІ

Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў,

АДКРЫТА ад 9 гадз. ран. да 9 г. веч.

Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:

па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-вэнэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.

Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрытыя 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.

Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 6 г. да 8 г. увеч.

ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. веч. штодзённа

Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.

Урачэбная дапамога на дому па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 9 гадз. веч.

Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную дыфэрэнцыяваную плату.

Друкарня газ. «Зьвязда», Менск.

Менск. Гапоўпр